Astrid Lindgren

Піпі

ДОЎГАЯ ПАНЧОХА ПАДЫМАЕЦЦА НА БОРТ

Астрыд Ліндгрэн

ІЛЮСТРАЦЫІ ІНГРЫД ВАНГ НЮМАН

Астрыд Ліндгрэн

Піпі

ДОЎГАЯ ПАНЧОХА ПАДЫМАЕЦЦА НА БОРТ

Астрыд Ліндгрэн

Піпі

ДОЎГАЯ ПАНЧОХА ПАДЫМАЕЦЦА НА БОРТ

Ілюстрацыі Інгрыд Ванг Нюман

Пераклад са шведскай Алены Казловай

ПАПУРЫ
Мінск

УДК 821.113.6-34-93
ББК 84(4Шве)-44
Л59

Аповесць упершыню апублікавана ў 1946 г. выдавецтвам Rabén & Sjögren, Швецыя.
Дадатковую інфармацыю пра Астрыд Ліндгрэн можна атрымаць на сайце www.astridlindgren.com.
Усе правы на твор належаць кампаніі Astrid Lindgren, Стакгольм, Швецыя.
Па дадатковую інфармацыю звяртайцеся: info@astridlindgren.se

Пераклад зроблены паводле выдання:
Astrid Lindgren. Pippi Långstrump går ombord; Illustrationer av Ingrid Vang Nyman. — Rabén & Sjögren, 2020

ISBN 978-985-15-4681-3

© Text: Astrid Lindgren / The Astrid Lindgren Company
© Illustrations: Ingrid Vang Nyman, 1946
© Пераклад, афармленне, выданне на беларускай мове. ТАА «Папуры», 2020

ПІПІ ЎСЁ ЯШЧЭ ЖЫВЕ НА ВІЛЕ «НАПРАКУДЗІЛЕ»

Калі б вы апынуліся праездам у гэтым маленькім гарадку і, можа быць, раптам заблукалі на самай ускраіне, то вы ўбачылі б віллу «Напракудзілу». Не сказаць, каб той дом быў асабліва адметны з выгляду, — проста вельмі старая віла з занядбаным садам вакол, але вы б усё адно, напэўна, спыніліся і пацікавіліся, хто там жыве. Усе людзі ў гэтым маленькім гарадку ведалі, хто жыве на віле «Напракудзіле», ведалі яны таксама і тое, чаму на верандзе дома стаіць конь. Але калі вы з іншых мясцін, то як вам пра гэта здагадацца, таму вы напэўна палічылі б, што гэта дзіўна. Асабліва тады, калі, нягледзячы на сапраўды вельмі позні час, упоцемках у садзе вы заўважылі б маленькую дзяўчынку, якая гулялася там, і было б зусім не падобна, што яна хутка збіраецца спаць. Тады можна было б падумаць: «Цікава, чаму мама дзяўчынкі

не сочыць, каб тая ішла ў ложак? Усе ж дзеці ў такую пару ўжо спяць».

Але ж адкуль каму ведаць, што ў маленькай дзяўчынкі не было мамы? Не было ў яе і таты, прынамсі дома. Так выйшла, што яна жыла на віле «Напракудзіле» зусім адна. Ну, можа быць, не

зусім-зусім адна, калі ўжо казаць вельмі дакладна. Усё-такі на верандзе жыў ейны конь, а таксама ў яе была малпа на імя Спадар Нільсан. Але пра ўсё гэта ніяк немагчыма было ведаць, калі б вы проста апынуліся ў гарадку праездам. Калі б дзяўчынка падышла да брамкі — а гэта яна дакладна зрабіла б, бо ёй падабалася гутарыць з людзьмі, — то можна было б разглядзець яе як след, а тады мо падумаць: «Гэта, мусіць, самае рабаціністае і рудавалосае дзіця на маёй памяці».

Потым, мабыць, разважыш: «І, дарэчы, вельмі здорава мець столькі рабацінак і рудыя валасы. Прынамсі, калі выглядаеш настолькі ж радасна, як гэтае дзіця».

Як жа звалі маленькую рудавалосую дзяўчынку, якая з задавастым выглядам хадзіла адна ў прыцемках? Стоячы каля самай брамкі, якраз і зручна было б спытаць:

— Як цябе завуць?

Адказ не прымусіў бы сябе чакаць, вы пачулі б вельмі шчаслівы і радасны голас:

— Мяне завуць Піпілота Цыкорыя Гардзіна Правіянта Эфраімаўна Доўгая Панчоха, дачка

капітана Эфраіма Доўгай Панчохі, колісь жаху сямі мораў, на сёння ціхаакіянскага караля. Але мяне называюць проста Пі́пі!

Так яно і было! Гэтую дзяўчынку звалі Піпі Доўгая Панчоха. Што да яе слоў пра тату — ціхаакіянскага караля, то гэта тое, ува што яна сама верыла. Яе бацьку аднойчы здзьмула ў мора, і ён прапаў, калі яны з Піпі плавалі на караблі па морах і акіянах, але, паколькі Піпін тата меў ладны жывот, Піпі была абсалютна ўпэўненая, што ён не патануў. Хутчэй за ўсё яго вынесла на бераг востраў, дзе ён зрабіўся каралём барабохаў. Вось у чым была ўпэўненая Піпі.

Маючы дастаткова часу і не спяшаючыся на цягнік тым жа вечарам, можна было б разгаварыцца з Піпі, тады паступова зрабілася б ясна, што на віле «Напракудзіле» яна жыве зусім адна, калі не лічыць каня і малпы. І калі маеш добрае сэрца, то як тут не падумаць: «На якія сродкі жыве гаротнае дзіця?» Але за гэта можна было не хвалявацца.

— Я багатая, як троль, — казала часам сама Піпі.

Так яно і было. Яна мела цэлы чамадан залатых манет, які атрымала ад таты. Таму чулыя

людзі маглі не хвалявацца, Піпі ўсяго хапала. Яна вельмі добра абыходзілася без таты і мамы. Безумоўна, не было нікога, хто мог бы загадаць ёй ісці класціся спаць увечары. Але Піпі прыдумала добрую завядзёнку: яна загадвала сама сабе! Часам яна не клала сябе спаць да дзясятай гадзіны, бо Піпі ніколі не лічыла, што дзецям абавязкова ісці спаць а сёмай. Гэта ж самы вясёлы час! Дык чаго здзіўляцца, як бачыш Піпі, што гуляецца ў садзе пасля заходу сонца, калі ўжо крыху адчуваецца вечаровая прахалода, а Томі і Áніка даўно сапуць у ложках. Хто такія Томі і Аніка? Ой, пра гэта ж і праўда немагчыма ведаць, проста апынуўшыся ў гарадку праездам! Томі і Аніка — Піпіны сябры па гульнях. Яны жывуць у доме побач з вілай «Напракудзілай». Эх, завітаўшы трошкі раней, можна было б убачыць Томі і Аніку. Гэта двое вельмі мілых, проста цудоўных дзяцей. Можна не сумнявацца, што, прыйшоўшы раней, вы дакладна заспелі б Томі і Аніку дома ў Піпі. Бо Томі і Аніка бегалі да сяброўкі штодня і заўжды бавілі ў яе час, хіба што апрача таго, калі трэба было спаць, есці і хадзіць у школу.



Але гэткай позняй парой яны, зразумела, ужо спалі, бо ў Томі і Анікі былі і тата і мама, і яны абое, і тата і мама, меркавалі, што дзецям вельмі карысна класціся спаць а сёмай гадзіне.



Вось так усё выглядала на віле «Напракудзіле»

Маючы ў запасе вельмі-вельмі шмат часу, можна было б пастаяць яшчэ, пакуль Піпі не скажа «дабранач» і не пойдзе ў дом. Тады вы ўбачылі б, чым бавіцца Піпі, застаўшыся адна, калі не збіраецца

тут жа класціся спаць. Можна было б пастаяць за слупом брамкі і крыху паназіраць. А што, калі Піпі зрабіла б акурат тое, што і звычайна па вечарах, калі ёй хацелася пакатацца на кані! Уявіце: яна ідзе на веранду, моцнымі рукамі падымае каня ўгару і выносіць яго ў сад! Тут бадай, вочы пратрэш і падумаеш, што спіш.

— А мамачкі, што ж гэта за дзіця такое, — магчыма, скажаш сабе, стоячы за слупом брамкі. — Падумаць толькі, каня цягае! Гэта самае незвычайнае дзіця на маёй памяці!

І вы мелі б рацыю. Піпі была самым незвычайным дзіцём — прынамсі ў гэтым гарадку. Мо ў іншых мясцінах і сустракаліся незвычайныя дзеці, але ў маленькім гарадку роўных Піпі Доўгай Панчосе не было. І нідзе — ні тут, ні ў якім іншым месцы на зямным шары — не існавала нікога мацнейшага за яе.

ПІПІ ІДЗЕ ПА КРАМАХ

Цудоўным вясновым днём, калі свяціла сонейка, цвыркалі птушкі і ва ўсіх канавах цурчала вада, Томі і Аніка подскакам прыбеглі да Піпі. У Томі было з сабой два кавалачкі цукру для Піпінага каня, таму брат з сястрой крыху затрымаліся на верандзе і пагладзілі каня, перш чым зайсці ў дом да Піпі. Калі яны прыйшлі, Піпі спала. Яе ногі ляжалі на падушцы, а галава — пад коўдрай. Піпі заўжды так спала. Аніка ўшчыкнула яе за вялікі палец нагі і сказала:

— Прачынайся!

Спадар Нільсан, маленькая мартышка, ужо прачнуўся і паспеў заскочыць на лямпу на століе. Пакрысе пад коўдрай пачалося варушэнне, і нечакана з-пад яе высунулася рудая галава. Піпі расплюшчыла ясныя вочы і шырока ўсміхнулася.

— Аёй, гэта вы шчыкаеце мяне за пальцы! А мне прысніласа, што гэта тата правярае, ці няма ў мяне гузакоў.

Яна села на край ложка і нацягнула па чарзе панчохі, адну карычневую і другую чорную.

— Не-е, гузакоў не бывае, калі насіць вось гэта, — заявіла яна, засоўваючы ногі ў вялізныя чорныя чаравікі, на два памеры ёй большыя.

— Піпі, — сказаў Томі, — што мы будзем рабіць сёння? У нас з Анікай канікулы!

— Ёсць пра што падумаць, — адказала Піпі. — Танцаваць вакол ялінкі мы не можам, бо мы яе вынеслі тры месяцы таму. А то дык рассякалі б па лёдзе да абеда. Капаць золата было б вельмі пацешна, але таксама не атрымаецца, бо мы не ведаем, дзе тое золата закапанае. Дарэчы, золата багата на Алясцы, але там столькі золаташукальнікаў, што не праштурхнуцца. Не, давядзецца нам знайсці нешта іншае.

— Ага, нешта пацешнае, — сказала Аніка.

Піпі заплятала валасы ў дзве тугія коскі, якія тырчалі ў бакі. Яна разважала.

— А ці не пайсці нам панакупляць пакупак? Хадзем па крамах? — нарэшце прапанавала яна.

— Але ў нас няма грошай, — адказаў Томі.

— У мяне ёсць, — запярэчыла Піпі.



Як доказ яна тут жа дастала і адкрыла чамадан, поўны залатых манет. Яна загрэбла ладную жменю і сунула грошы ў кішэню фартуха пасярэдзіне жывата.

— Мне трэба толькі надзець капялюш — і я гатовая, — сказала яна.

Капелюша нідзе не было відаць. Спачатку Піпі паглядзела ў скрыні для дроў, але, як ні дзіўна, там яго не было. Потым яна паглядзела ў хлебніцы

ў каморы, але там ляжалі толькі падвязка для панчохі, зламаны будзільнік і скарыначка. Нарэшце яна паглядзела нават на вешалцы для капелюшоў, але і там не было нічога апроч патэльні, адкруткі і кавалачка сыру.

— Ніякага парадку, анічога не знайсці, — змрочна сказала Піпі. — Хоць гэтага кавалка сыру мне даўно не хапала. Пашанцавала, што ён быў на месцы. Гэй, капялюш! — крыкнула яна. — Ты ідзеш з намі па крамах ці не? Калі ты зараз не выйдзеш, будзе позна!

Ніякага капелюша не з'явілася.

— Ну ўсё, хай крыўдуе на сябе, калі такі дурнаваты. Але каб апасля мне не скардзіўся! — строга сказала яна.

Ужо неўзабаве можна было ўбачыць, як яны тупаюць па вуліцы ў горад: Піпі са Спадаром Нільсанам на плячы, Томі і Аніка. Свяціла такое цудоўнае сонейка, неба было такое блакітнае, а дзеці такія шчаслівыя! З прыдарожнай канавы даносілася цурчанне. Гэта была глыбокая канава, поўная вады.

— Так ужо люблю канавы, аж не магу, — сказала Піпі і, не раздумваючы, зайшла ў яе.

Вада даставала ёй вышэй каленяў. Калі Піпі скакала як след, на Томі і Аніку ляцелі пырскі.

— Я гуляюся, быццам я лодка, — сказала яна, ідучы праз ваду.

Толькі яна так сказала, як спатыкнулася і знікла пад вадой.

— Правільней сказаць: падводная лодка, — бесклапотна працягнула яна, вынырнуўшы.

— Але, Піпі, ты ж цяпер цалкам мокрая, — устурбавана сказала Аніка.

— І што? — спытала Піпі. — Хто сказаў, што дзеці абавязкова павінны быць сухімі? Я чула, што ад абцірання халоднай вадой здаравееш. Толькі ў гэтай краіне чамусьці лічаць, што дзецям не месца ў канавах. У Амерыцы дык канавы бітма набітыя дзецьмі так, што вада не ўлазіць. Іх там трымаюць круглы год. Зімой, праўда, яны ўмярзаюць, і толькі галовы вытыркаюцца з-пад лёду. Іх мамы носяць ім кісель і фрыкадэлькі, бо дзеці не могуць прыйсці дадому на абед. Але здароўечка ў іх узорнае, ужо будзьце пэўныя!

У святле вясновага сонца гарадок выглядаў вельмі хораша. Вузкія брукаваныя вуліцы звіваліся паміж дамамі. На невялікіх клумбах, разбітых амаль пры кожным доме, прараслі падснежнікі і крокусы. Крамаў у гарадку хапала. У гэты цудоўны вясновы дзень праз іх дзверы сноўдала туды-сюды шмат народу, крамныя званочкі звінелі няспынна. Кабеты ішлі з кошыкамі на локціку па каву і цукар, мыла і масла. Многія гарадскія дзеці таксама выйшлі, каб купіць сабе ірыску альбо пачак жуйкі. Але ў большасці дзяцей не было грошай на пакупкі, і небаракам даводзілася толькі стаяць пад крамамі і глядзець на ласункі ў вітрынах.

І вось, калі сонейка свяціла найхарашэй, на вуліцы Стургатан паказаліся тры маленькія постаці. Гэта былі Томі і Аніка, а таксама Піпі, вельмі мокрая Піпі, за якой следам цягнулася ручаінка.

— Як нам пашанцавала, — сказала Аніка. — Паглядзіце, колькі шмат крам, а ў нас цэлая кішэня залатых манет.

Томі таксама так узрадаваўся, падумаўшы пра гэта, што ажно высока падскокнуў.

— Ну што ж, бадай, пачнем, — сказала Піпі. — У першую чаргу я хацела б прыкупіць сабе піяніну.

— Але слухай, Піпі, — сказаў Томі, — ты хіба ўмееш граць на піяніна?

— А я што, ведаю? Я ж ні разу не спрабавала, — сказала Піпі. — У мяне ніколі не было

піяніны, каб паспрабаваць. Павер мне, Томі: каб граць на піяніне без піяніны, трэба дужа шмат трэніравацца, пакуль не заўмееш.

Піянінавай крамы дзеці не ўбачылі, затое яны дайшлі да крамы касметыкі. На вітрыне стаяў вялікі слоік сродку ад рабацінак, а побач са слоікам ляжала кардонка, на якой было напісана: «ПАКУТУЕЦЕ НА РАБАЦІНКІ?»

— Што напісана на кардонцы? — спытала Піпі.

Піпі не была вялікая спецыялісткай у чытанні, бо яна не хацела хадзіць у школу, як астатнія дзеці.

— Тут напісана: «Пакутуеце на рабацінкі?» — сказала Аніка.

— Вось як, — задуменна сказала Піпі. — Ветлівае пытанне вымагае ветлівага адказу. Завітайма?

Яна адчыніла дзверы і зайшла, і за ёй — Томі і Аніка. За прылаўкам стаяла пажылая спадарыня. Піпі накіравалася адразу да яе.

— Не, — упэўнена сказала Піпі.

— Што ты хочаш? — спытала спадарыня.

— Не, — паўтарыла Піпі.

— Я не разумею, што ты маеш на ўвазе, — сказала спадарыня.

— Не, я не пакутую на рабацінкі, — растлумачыла Піпі.

Цяпер спадарыня скеміла. Але, аглядзеўшы Піпі, яна выгукнула:

— Але, мілае дзіця, у цябе ж увесь твар у рабацінках!

— Так і ёсць, — сказала Піпі. — Але я не пакутую. Мне яны падабаюцца! Добрай раніцы!

Яна пайшла на выхад. У дзвярах яна павярнулася і крыкнула:

— Але калі знойдзеце нейкую мазь, ад якой з'яўляецца яшчэ больш рабацінак, можаце даслаць мне сем—восем слоікаў.

Побач з крамай касметыкі знаходзілася крама жаночага адзення.

— Нешта мы не надта прасунуліся ў куплянні, — сказала Піпі. — Трэба пачаць па-сапраўднаму.

І яны рушылі наперад у краму — Піпі, потым Томі і затым Аніка. Першым, што яны ўбачылі, была вельмі прыгожая лялька-манекен у сіняй шаўковай сукенцы. Піпі падышла да манекена і сардэчна паціснула ёй руку.

— Дбрдзень-дбрдзень, — сказала яна. — Як я разумею, вы тая фру, якая трымае гэтую краму. Страшна прыемна пазнаёміцца, — сказала яна і яшчэ сардэчней патрэсла руку манекена. І тут здарылася страшнае: гэтая рука аддзялілася і выслізнула з шаўковага рукава. Томі адкрыў рот ад жаху, Аніка ледзь не заплакала. У Піпі ў руках засталося доўгае белае штучнае перадплечча. Прыбег прадавец і пачаў моцна сварыцца на яе.

— Грам на дзвесце паспакойней, — сказала Піпі пасля таго, як некаторы час паслухала яго. — Я думала, тут у вас самаабслугоўванне, і збіралася набыць гэтую руку.

Тады прадавец яшчэ больш раззлаваўся і сказаў, што манекен не прадаецца, і наогул нельга было б купіць толькі адну руку. Цяпер Піпі павінна аплаціць цэлы манекен, бо яна яго зламала.

— Вельмі незвычайна, — сказала Піпі. — Добра, што не ўсе крамы такія ненармальныя. Уявіце, што наступным разам я захачу купіць галёнку да пюрэ на абед, пайду да мясніка, а ён мне: не-не, прадаецца толькі свіння цалкам!

Кажучы гэтак, шырокім жэстам Піпі выцягнула пару залатых манет з кішэні фартушка і выклала іх на прылавак. Прадаўцу ажно мову заняло ад агаломшання.

— Ці лялька каштуе болей? — пацікавілася Піпі.

— Не, безумоўна не, яна каштуе і блізка не так шмат, — адказаў прадавец і ветліва пакланіўся.

— Рэшту пакінь сабе і купі што-небудзь смачнае дзеткам, — сказала Піпі і пайшла на выхад.

Прадавец кінуўся за ёй, увесь час кланяючыся, і спытаў, куды ён можа адправіць манекен.

— Мне патрэбная толькі гэтая рука, і я вазьму яе з сабой, — сказала Піпі. — Астатняе можаш раздаць бедным. Бывай!

— Але навошта табе гэтая рука? — пацікавіўся Томі, калі яны выйшлі на вуліцу.

— Навошта? Ты пытаеш, навошта мне гэта? — сказала Піпі. — Хіба людзі не маюць штучных зубоў і штучных валасоў? І нават штучных насоў часам? А я не магу займець адну-адненькую штучную руку? Паміж іншым, павер ты мне, мець тры рукі страшна зручна. Памятаю, калі мы

з татам плавалі па морах і акіянах, прыплылі мы аднойчы ў такі горад, дзе ва ўсіх было па тры рукі. Лоўка, га? Уяві: яны ядуць, у адной руцэ — відэлец, у другой — нож, і раптам — хоп, трэба пакалупацца ў носе ці пачухаць вуха. Не, зусім не дурная думка прыдбаць сабе трэцюю руку. Так шмат часу вызваляецца.

Піпі выглядала задуменнай.

— Эх, вось жа я расхлусілася, — сказала яна. — Дзіўна гэта. З мяне такі фантан маны б'е, што я не магу стрымацца. Шчыра кажучы, не было ніякіх трохрукіх у тым горадзе. А толькі двухрукія. — Яна памаўчала крыху, задумаўшыся. — Большасць, паміж іншым, былі аднарукія, — сказала яна. — Калі ўжо выкладваць праўду, то некаторыя былі нават зусім нікалькінярукія і, каб паесці, кусалі проста з талеркі. А пачухаць вуха прасілі маму. Вось так было папраўдзе.

Піпі засмучана паківала галавой.

— Факт, што я ніколі нідзе не бачыла такога маларучча, як менавіта ў тым горадзе. Але ў гэтым уся я. Вечна мне трэба ўдаваць з сябе важную

і незвычайную і выдумляць, што ў людзей болей рук, чым яны маюць насамрэч.

Піпі пашыбавала далей, перакінуўшы штучную руку праз плячо. Перад крамай цукерак яна спынілася. Там стаяў цэлы натоўп дзяцей, проста загіпнатызаваных хараством і раскошай за шклом вітрыны. Вялікія слоікі, поўныя чырвоных, блакітных і зялёных карамелек, доўгія шэрагі шакаладнага пячэння, цэлыя горкі жуек і спакуслівых ірысак — не дзіва, што малыя стаялі там, не ў змозе адвесці вачэй, а потым, цяжка ўздыхнуўшы, сыходзілі. Бо яны не мелі грошай, нават драбнюткай манеткі пяць эрэ.

— Піпі, а мы пойдзем у гэтую краму? — нецярпліва спытаў Томі і тузануў Піпі за сукенку.

— У гэтую краму мы яшчэ як пойдзем, — урачыста сказала Піпі. — Ух, як мы пойдзем!

Так яны і зрабілі.

— Мне, калі ласка, васямнаццаць кіло цукерак, — сказала Піпі і памахала залатой манетай.

Цётачка за прылаўкам толькі рот адкрыла ад здзіўлення. Яна не прызвычаілася, каб хтосьці купляў так шмат цукерак за раз.



— Ты маеш на ўвазе, што табе васямнаццаць цукерак? — удакладніла яна.

— Я маю на ўвазе, што мне васямнаццаць кілаграм цукерак, — сказала Піпі.

Яна паклала залатую манету на прылавак. І тады прадавачка пачала спехам чэрпаць прысмакі і накладаць іх у вялікія пакеты. Томі і Аніка

стаялі побач і паказвалі на самыя смачныя цукеркі. Напрыклад, там былі чырвоныя карамелькі, проста выдатныя. Калі іх трошкі пасмактаць, раптам у роце растае дзівосная начынка. Яшчэ былі зялёныя, кісленькія, вельмі нават неблагія. Жэлейныя малінкі і лакрычныя лодачкі таксама былі смаката.

— Давайце возьмем па тры кілаграмы кожных, — прапанавала Аніка.

Так яны і зрабілі.

— Калі можна, яшчэ шэсцьдзясят смактулек на палачцы і семдзесят два пачкі ірысак, і тады, відаць, мне не спатрэбіцца болей, чым сто тры шакаладныя трубачкі, — сказала Піпі. — І мне, бадай, патрэбная маленькая тачка, каб я магла ўсё гэта забраць.

Прадавачка сказала, што тачку можна набыць у краме цацак насупраць.

Перад вітрынай цукерні сабралася вельмі шмат дзяцей, якія ўсе вочы праглядзелі і ледзь не млелі ад хвалявання, назіраючы, як закупляецца Піпі. Піпі хуценька збегала ў суседнюю краму цацак, купіла там тачку і пагрузіла на яе ўсе свае пакеты. Потым яна аглядзелася вакол і крыкнула:

— Ці ёсць тут такія дзеці, хто не есць цукерак? Калі ласка, зрабіце крок наперад!

Ніхто не варухнуўся.

— Дзіва дзіўнае, — сказала Піпі. — У такім разе ці ёсць тут дзеці, якія цукеркі ядуць?

Наперад выступілі дваццаць тры чалавекі. Сярод іх — таксама Томі і Аніка.

— Томі, адкрывай пакеты, — сказала Піпі.

Томі адкрыў. І тады пачалося паяданне цукерак, роўнага якому не бачылі ў гарадку ніколі. Усе дзеці набівалі поўныя раты цукерак: чырвоных карамелек са смачнай начынкай, зялёных кісленькіх, лакрычных лодачак і жэлейных малінак уперамежку. І шакаладныя трубачкі таксама прасіліся ў рот, бо шакаладны смак вельмі прыемна спалучаўся са смакам малінавых жэлеек. Адусюль беглі новыя

і новыя дзеці, і Піпі поўнымі жменямі раздавала цукеркі.

— Бадай, трэба дакупіць яшчэ васямнаццаць кіло, — сказала яна. — А інакш нічога не застанецца на заўтра.

Піпі купіла яшчэ васямнаццаць кілаграм, але ўсё адно на заўтра засталося не так і шмат.

— А зараз хадзем у наступную краму, — сказала Піпі і рушыла ў краму цацак.

Усе дзеці пацягнуліся за ёй. У цацачнай краме было шмат цудоўнага: чыгунка з цягнічкамі, машынкі, якія можна было катаць, харошанькія лялькі ў прыгожых сукенках, цацачныя сервізы і пісталеты з пістонамі, алавяныя салдацікі, плюшавыя сабачкі і слонікі, закладкі для кніг і фігуркі-дрыгунчыкі.

— Што пажадаеце? — спытала прадавачка.

— Мы пажадаем усяго патроху, — сказала Піпі і аглядзелася вакол, вывучаючы асартымент на паліцах. — Напрыклад, мы церпім на востры недахоп дрыгунчыкаў і пісталецікаў з пістонамі, — працягнула яна. — Але спадзяюся, што гэта неяк вырашыцца.

І Піпі дастала цэлы кулак залатых манет. Дзеці пачалі паказваць, што іх душа жадала болей за ўсё. Аніка выбрала цудоўную ляльку са светлымі кудзеркамі, апранутую ў ружовую шаўковую сукенку. Лялька ўмела казаць «мама», калі націскаеш ёй на жывот. Томі захацеў стрэльбу і паравую машыну. І гэта ён атрымаў. Усе астатнія дзеці таксама паказвалі на тое, што яны хацелі б, і калі Піпі скончыла рабіць пакупкі ў гэтай краме, на паліцах там засталося не так і шмат — некалькі кніжных закладак і яшчэ менш кубікаў. Сабе Піпі не купіла нічога, але Спадар Нільсан атрымаў люстэрка.

Перад сыходам Піпі купіла ўсім дзецям па гліняной птушачцы-свісцёлцы, дзеці выйшлі на вуліцу і пачалі ў іх свістаць, а Піпі адбівала такт штучнай рукой. Адзін маленькі хлопчык паскардзіўся, што ягоная птушачка не свісціць. Піпі ўзяла яе, каб праверыць.

— Не, вы толькі палюбуйцеся, дзірачка, у якую трэба дзьмуць, залеплена жуйкай! Дзе ты знашоў такі скарб? — спытала яна і выкінула вялікі белы камяк. — Я ж спецыяльна не купляла ніякіх жуек.

— Я жаваў яе з пятніцы, — сказаў хлопчык.

— І ты не баішся, што ў цябе рот зарасце? Я думала, што гэтым заканчваецца ўсякае жаванне жуйкі.

Яна аддала хлопчыку гліняную птушачку, і ён засвістаў у яе гэтак жа радасна, як і ўсе астатнія.

На вуліцы Стургатан утварыўся такі гармідар, што нарэшце прыйшоў паліцэйскі, каб паглядзець, што адбываецца.

— Што за шум? — крыкнуў ён.

— Гэта парадны марш Крунубергскага палка, — сказала Піпі. — Але я не пэўная ў тым, што

ўсе дзеці ў курсе. Некаторыя думаюць, што мы выконваем марш Мендэльсона.

— Зараз жа спыніцеся, — гыркнуў паліцэйскі, закрываючы рукамі вушы.

Піпі папляскала яго штучнай рукой па спіне.

— Радуйся, што мы не купілі трамбоны, — сказала яна.

Паступова свісцёлкі сціхлі адна за адной. Пад канец рэдкі «піп-піп» часу ад часу чуўся толькі з птушачкі Томі. Паліцэйскі вельмі строга сказаў, што ніякіх зборышчаў на Стургатан не дазваляецца і ўсе дзеці павінны рызысціся па дамах.

Дзеці не мелі нічога супраць. Ім хацелася паспрабаваць запусціць свае цягнічкі, пакатаць машынкі і ўкласці спаць новых лялек. Усе яны адправіліся дадому шчаслівыя і задаволеныя. У той дзень яны зусім не вячэралі.

Піпі, Томі і Аніцы таксама трэба было ісці дадому. Піпі каціла за сабой тачку. Па дарозе яна разглядала ўсе шыльды і чытала па складах, як умела.

— А-пэ-тэ-ка — ага, ці не тут купляюць аплекі? — спытала яна.

— Лекі, — паправіла Аніка. — Так, іх купляюць тут.

— Ой, мне тэрмінова трэба, — сказала Піпі.

— Ты ж не хворая, — сказаў Томі.

— Сёння не, а заўтра хто ведае, — сказала Піпі. — Штогод процьма людзей хварэе і мрэ толькі таму, што яны своечасова не набылі аплекаў. Мяне такі лёс не напаткае!

У аптэцы стаяў аптэкар і ляпіў пігулкі. Ён збіраўся зрабіць толькі пару апошніх, бо час быў позні і хутка яму трэба было зачыняцца І тут да прылаўка падышлі Піпі, Томі і Аніка.

— Мне, калі ласка, чатыры літры аплекаў, — папрасіла Піпі.

— Якіх лекаў? — раздражнёна спытаў аптэкар.

— Такіх, каб дапамагалі ад немачы, — сказала Піпі.

— Якой немачы? — яшчэ больш раздражнёна спытаў аптэкар.

— Ну, такое мне дай, каб палячыцца, калі коклюш, мазалі на нагах, жывот баліць, краснуха ці там гарошына выпадкова ў нос залезла — ад любой трасцы. Яшчэ добра, каб імі можна было паліраваць мэблю. Дай мне вельмі дзейсных аплекаў.

Аптэкар сказаў, што лекаў настолькі шырокага дзеяння не бывае. Ад розных хвароб — розныя сродкі, сцвярджаў ён, а калі Піпі назвала яшчэ дзясятак іншых немачаў, ад якіх яна хацела палячыцца, ён выставіў на прылавак цэлы шэраг бутэлечак. На некаторых ён напісаў «для вонкавага прымянення», што значыла, што гэты сродак можна толькі мазаць на сябе. Піпі заплаціла, узяла бутэлечкі, падзякавала і выйшла.

Томі і Аніка пайшлі за ёй. Зірнуўшы на гадзіннік, аптэкар зразумеў, што пара зачыняцца. Ён як след замкнуў дзверы за дзецьмі і ўжо ўяўляў, як цудоўна прыйдзе дадому і пад'есць.

На дварэ Піпі паставіла свае бутэлечкі на зямлю.

— Аёй, аёй, ледзь не забылася на самае галоўнае, — сказала яна.

Паколькі дзверы ўжо былі зачыненыя, яна доўга і моцна ціснула на званок. Томі і Аніка чулі, як пранізліва звінела ў аптэцы. Праз момант у дзвярах адчынілася акенца — гэта было такое акенца,

праз якое купляюць лекі, калі захварэеш уначы. Аптэкар высунуў галаву. У яго быў вельмі чырвоны твар.

— Што табе яшчэ? — злосна спытаў ён у Піпі.

— Я дзіка выбачаюся, шаноўны пукатэкар, — сказала Піпі, — але мне тут падумалася адна рэч. Ты ж так добра знаешся на хваробах, а вось што лепей дапамагае ад жывата: прыняць цёплых клёцак ці легчы жыватом у таз з халоднай вадой?

Аптэкар яшчэ болей пачырванеў.

— Згінь, — гыркнуў ён, — і зараз жа, бо будзе табе!

Ён з бразгатам зачыніў акенца.

— Які звадлівы, га, — сказала Піпі. — Можна падумаць, быццам я нешта дрэннае зрабіла.

Яна пазваніла яшчэ раз, і ўжо праз пару секундаў у акенца зноў высунуўся аптэкар. Яго твар быў проста барвовы.

— Ад цёплых клёцак жа, напэўна, пучыць? — працягнула гутарку Піпі, ласкава гледзячы на яго.

Аптэкар нічога не адказаў, а толькі зноў бразнуў акенцам.

— Што ж, — сказала Піпі і паціснула плячыма, — тады я паспрабую цёплыя клёцкі. Сам будзе вінаваты, калі мне будзе пучыць жывот.

Яна ціха прысела на лесвіцы перад аптэкай і паставіла ў радок свае бутэлечкі.

— Падумаць толькі, якімі непрактычнымі бываюць дарослыя людзі, — сказала яна. — Тут у мяне — дайце зірнуць — восем бутэлечак, а, паміж іншым, усё цудоўна ўлезе ў адну. Добра хоць, калі сама троху цяміш.

З гэтымі словамі Піпі зняла вечкі з бутэлек і пераліла ўсе лекі ў адну бутэльку. Потым яна добра патрэсла яе, паднесла да рота і вялікімі глыткамі з яе папіла. Аніка, якая ведала, што часткай лекаў можна было толькі мазацца, крыху захвалявалася.

— Але, Піпі, — сказала яна, — як ты можаш ведаць, што яны неатрутныя?

— Я гэта заўважу, — весела сказала Піпі, — самае позняе — заўтра. Калі я буду яшчэ жывая, то яны неатрутныя, а значыць, любое малое дзіця можа іх піць.

Томі і Аніка абдумалі гэта. Памаўчаўшы крыху, Томі з сумневам і крыху прыгнечана сказаў:

— Але калі яны ўсё-ткі атрутныя, што тады будзе?

— Тады возьмеце тое, што засталося ў бутэльцы, і папаліруеце гэтым мэблю, — сказала Піпі. — Атрутныя ці не, але хоць недарэмна купленыя аплекі.

Яна ўзяла бутэльку і паклала яе ў тачку. Там ужо ляжалі рука ад манекена, паравая машына Томі, стрэльба, лялька Анікі і пакецік з пяццю чырвонымі карамелькамі. Гэта тое, што засталося ад васямнаццаці кілаграм. Яшчэ там сядзеў Спадар Нільсан. Ён стаміўся і хацеў ехаць.

— Паміж іншым, па-мойму, аплекі — першакласныя. Я пачуваюся ў сто разоў здаравейшай і больш бадзёрай. Асабліва адчуваецца ў хвасце, — сказала Піпі і пакруціла туды-сюды задам.

Піпі пакаціла тачку, кіруючыся да вілы «Напракудзілы». Томі і Аніка ішлі побач, і ім трошачкі балеў жывот.

ПІПІ ПІША ЛІСТ І ХОДЗІЦЬ У ШКОЛУ, АЛЕ ТОЛЬКІ КРЫХУ

— Сёння, — сказаў Томі, — мы з Анікай напісалі ліст нашай бабулі.

— Вось як? — сказала Піпі, працягваючы мяшаць у каструлі ручкай парасона. — У мяне будзе цудоўная вячэра, — сказала яна, нахілілася і панюхала. — «Варыць гадзіну, інтэнсіўна мяшаючы, і падаваць адразу ж без імберцу». Што ты сказаў? Ты напісаў бабулі?

— Ага, — сказаў Томі, які сядзеў на Піпінай скрыні для дроў і боўтаў нагамі, — і напэўна, хутка мы атрымаем ад яе адказ.

— Я дык ніколі не атрымліваю лістоў, — пакрыўджана сказала Піпі.

— Але ж ты іх і не пішаш, — сказала Аніка. — Калі сама не пішаш лістоў, то і не атрымліваеш іх.

— І гэта толькі праз тое, што ты не хочаш хадзіць у школу, — сказаў Томі. — Бо без школы ты не можаш навучыцца пісаць.

— Ды ўмею я пісаць, — сказала Піпі. — Я ведаю цэлую кучу літар. Фрыдальф, матрос з татавага карабля, навучыў мяне вельмі многім літарам. А калі бракуе літар, дык можна і лічбы выкарыстоўваць. Але праўда-праўда, я ўмею пісаць! Толькі не ведаю, пра што. Што звычайна пішуць у лістах?

— Ну, гэта, — сказаў Томі, — я звычайна спачатку пытаюся, як у бабулі здароўе, а потым пішу, што маё здароўе добрае. І потым я звычайна расказваю пра надвор'е і ўсякае такое. Сёння я напісаў яшчэ, што ў нашым падвале быў дохлы пацук.

Піпі працягвала размешваць і разважала.

— Бедная я, гаротная, ніхто мне не дасылае лістоў. А ўсім іншым дзецям дык дасылаюць. Так не можа больш працягвацца. І бабулі ў мяне няма, якая можа мне напісаць, то горш не будзе, калі я сама сабе напішу. І зраблю гэта зараз жа.

Яна адкрыла духоўку і зазірнула туды.

— Памятаецца, калі не памыляюся, тут была ручка.

Там сапраўды ляжала ручка. Піпі ўзяла яе, потым парвала папалам вялікі белы папяровы

пакет і ўселася за стол. Яна моцна наморшчыла лоб — выглядала, што яна ўсур'ёз задумалася.

— Не турбуйце мяне, я думаю, — сказала яна.

Томі і Аніка вырашылі, што пакуль пагуляюцца са Спадаром Нільсанам. Яны па чарзе здымалі з яго касцюмчык, а потым зноў надзявалі. Аніка таксама спрабавала пакласці Піпінага гадаванца ў зялёны цацачны ложак, дзе ў яго было



спальнае месца. Яна хацела гуляцца ў бальніцу — каб Томі быў урачом, а Спадар Нільсан хворым дзіцём. Але Спадар Нільсан упарта вылазіў з ложачка, а потым заскочыў на лямпу і павіс на хвасце. Піпі адарвалася ад пісання.

— Дурненькі Спадар Нільсан, — сказала Піпі. — Хворыя дзеці не вісяць на хвасце на лямпе. Прынамсі не ў гэтай краіне. Я чула, што ў далёкім замежжы такое здараецца. Калі ў якога дзіцяці трошкі падымаецца тэмпература, яго падвешваюць на лямпу, пакуль яму не палепшае. Але, прашу заўважыць, тут вам не там.

Нарэшце Томі і Аніка пакінулі Спадара Нільсана ў спакоі і заняліся часаннем каня. Конь вельмі ўзрадаваўся, калі яны прыйшлі да яго на веранду. Ён абнюхаў іх рукі, каб праверыць, ці няма ў іх з сабой цукру. Цукру не было, але Аніка збегала і прынесла пару кавалачкаў. Піпі ўсё пісала і пісала. І вось ліст быў гатовы. Толькі канверта не ставала, але Томі збегаў дадому і прынёс адтуль адзін для Піпі. Таксама ён даў ёй марку. Піпі старанна вывела на ім сваё імя: Фрэ́кен Піпі-лота Доўгая Панчоха, віла «Напракудзіла».

— А што напісана ў гэтым лісце? — спытала Аніка.

— Адкуль мне ведаць, — сказала Піпі. — Я ж яго яшчэ не атрымала.

У гэты момант міма вілы «Напракудзілы» праходзіў паштальён.

— Во дык шанцуе, — сказала Піпі, — паштальён ідзе акурат тады, калі ён патрэбны.

Яна выбегла на вуліцу.

— Калі ласка, аднясіце ліст Піпі Доўгай Панчосе як мага хутчэй, — сказала яна. — Гэта тэрмінова.

Паштальён паглядзеў спярша на ліст, потым на Піпі.

— А хіба ты не Піпі Доўгая Панчоха? — азадачана спытаў ён.

— Ну напэўна ж я. А ты думаў, хто? Царыца Абісінская?

— Дык чаму ты сама не возьмеш гэты ліст? — сказаў паштальён.

— Чаму я сама не вазьму гэты ліст? Мне што, самой яго несці? Не, гэта ўжо занадта! Цяпер так заведзена, што людзі самі сабе павінны насіць

лісты? А паштальёны навошта? Тады можна адмяняць іх усіх. Ніколі я не чула большага глупства! Не, хлопчык мой, калі ты так завіхаешся на працы, табе ніколі не зрабіцца начальнікам пошты, павер ты мне!

Паштальён падумаў, што лепш зрабіць, як яна хоча. Ён пайшоў і прасунуў ліст у паштовую скрыню вілы «Напракудзілы». Не паспела пісьмо ўпасці, як Піпі нецярпліва яго ўхапіла.

— Як жа мне цікава, — сказала яна Томі і Аніцы. — Гэта першы ліст у жыцці, які я атрымліваю.

Дзеці ўселіся на лесвіцы на веранду, і Піпі разарвала канверт. Томі і Аніка чыталі праз яе плячо. Вось што там было напісана:



— О, Томі, у маім лісце тое самае, што ты напісаў сваёй бабулі, — задаволена сказала Піпі. — Так што можна быць упэўненай, што гэта сапраўдны ліст. Я буду захоўваць яго ўсё жыццё.

Яна паклала ліст у канверт, а канверт — у адну з шуфлядак вялікай камоды ў гасцёўні. Разглядаць цудоўныя рэчы ў камодзе Піпі было для Томі і Анікі ледзь не самым захапляльным на свеце. Піпі часта ўручала ім той-сёй падаруначак, але ўсё адно багаццю ў шуфлядках ніколі не было пераводу.

— І ўсё адно, — сказаў Томі, калі Піпі схавала ліст, — ты напісала ўсё з кучай памылак.

— Ага, табе трэба пахадзіць у школу і навучыцца пісаць трошкі лепей, — сказала Аніка.

— Дзякуй, — сказала Піпі. — Я аднойчы схадзіла на цэлы дзень і атрымала так шмат вучэння, што яно ў мяне дагэтуль у галаве булькоча.

— Але днямі мы ідзем у паход, — сказала Аніка, — цэлым класам.

— Кашмар, — сказала Піпі і закусіла адну са сваіх косак. — Кашмар! І мне пэўна ж туды нельга, бо я не хаджу ў школу! Людзі лічаць, што можна паводзіцца з табой як заўгодна толькі таму, што ты не пахадзіла ў школу і не павучыла мнаганожанне!

— Множанне, — паправіла Аніка.

— Я ж так і кажу — мнаганожанне.

— Мы пройдзем цэлыя два кіламетры, далёка ў лес. І там будзем гуляцца, — сказаў Томі.

— Кашмар, — паўтарыла Піпі.

На наступны дзень выдалася такое цёплае сонечнае надвор'е, што дзецям у маленькім гарадку было вельмі цяжка спакойна ўседзець за партамі. Настаўніца адчыніла ўсе вокны, каб зазірала сонейка. Проста каля школы расла бяроза, і на самай яе вяршыні сядзеў шпачок і свістаў так радасна, што Томі, Аніка і іншыя дзеці ў класе слухалі толькі яго, і іх мала цікавіла тое, што $9 \times 9 = 81$.

Раптам Томі ад здзіўлення падскочыў.

— Глядзіце, фрэкен, — сказаў ён і паказаў у бок акна, — там жа Піпі.

Усе дзеці паглядзелі туды. І сапраўды, там на бярозавай галіне сядзела Піпі — амаль каля акна, бо галіна цягнулася проста да падваконня.

— Здароў, фрэкен, — крыкнула яна. — Здароў, дзятва!

— Вітаю, мілая Піпі, — сказала настаўніца.

Аднойчы Піпі прыходзіла ў школу на цэлы дзень, таму настаўніца адразу яе пазнала. Піпі і настаўніца колісь дамовіліся, што Піпі, магчыма, прыйдзе назад у школу, калі трошкі падрасце і паразумнее.

— Што ты хочаш, мілая Піпі? — сказала настаўніца.

— Я тут гэта, хацела папрасіць цябе скінуць мне трошкі мнаганожання праз акно, — сказала Піпі. — Шмат не трэба, роўна столькі, каб мяне ўзялі ў паход. І калі вы прайшлі яшчэ якія-небудзь новыя літары, можаш скінуць мне іх таксама.

— Ты не хочаш зайсці да нас? — спытала настаўніца.

— Ні за што, — шчыра прызналася Піпі і лацвей уладкавалася на галіне. — Ад гэтага толькі завіхрэнні ў глуздах. Так і галава можа трэснуць. Але вось як ты думаеш, фрэкен, — працягнула яна з надзеяй, — вучоба не можа вылецець з акна і прыстаць да мяне? Столькі, каб мне хапіла пайсці ў паход?

— Можа здарыцца і такое, — сказала настаўніца.

І яна працягнула ўрок арыфметыкі. Дзецям у класе было вельмі прыемна тое, што Піпі

сядзіць на дрэве знадворку. Усе яны атрымлівалі ад яе цукеркі і цацкі ў той дзень, калі яна хадзіла па крамах. Піпі, натуральна, узяла з сабой Спадара Нільсана, і дзецям падабалася глядзець, як ён пералазіць з галіны на галіну. Часам ён заскокваў у акно, а раз скокнуў так далёка, што трапіў проста на галаву Томі і пачаў шукаць у яго валасах. Але тады настаўніца сказала Піпі, каб яна паклікала Спадара Нільсана, бо Томі акурат мусіў палічыць, колькі будзе 315 : 7, а гэта немагчыма рабіць з малпай на галаве. Але парадку на ўроку ўсё адно не было. Вясновае сонца, і шпак, і Піпі, і Спадар Нільсан — для дзяцей гэта было зашмат.

— Дзеці, думаю, вы ашалелі, — сказала настаўніца.

— Ага, ведаеш што, фрэкен, — сказала Піпі, седзячы на дрэве, — сказаць папраўдзе, гэты дзень не пасуе для мнаганожання.

— Мы займаемся дзяленнем, — сказала настаўніца.

— У такі дзень ніякімі «ннямі» займацца нельга, — сказала Піпі, — хіба толькі весяленнем.

І настаўніца здалася.

— Мо ты пакажаш нам некалькі прыёмаў весялення, Піпі? — сказала яна.

— Ну-у, не скажу, што я такая ўжо спецыялістка ў весяленні, — запярэчыла Піпі і павісла ўніз галавой на галіне так, што яе коскі ледзь не даставалі да зямлі. — Але я ведаю адну школу, дзе не робяць нічога апроч весялення. У раскладзе напісана: «Увесь дзень — весяленне».

— Вось як, — сказала настаўніца, — і дзе ж знаходзіцца тая школа?

— У Аўстраліі, — сказала Піпі, — у адным пасёлку на чыгуначнай станцыі ў Аўстраліі. З паўднёвага боку.

Яна ўселася на галіне, яе вочы ззялі.

— І як у іх адбываецца весяленне? — спытала настаўніца.

— Бывае па-рознаму, — сказала Піпі, — у асноўным пачынаюць са скокаў у акно адно за адным. Потым гарланяць што ёсць моцы, і зноў нясуцца ў клас, і там бегаюць па партах да знямогі.

— А што кажа іх настаўніца? — пацікавілася настаўніца.

— А яна… — сказала Піпі, — яна таксама бегае. Яшчэ дурней за астатніх. Потым дзеці б'юцца дзесь

паўгадзіны. Настаўніца стаіць побач і крычыць: «Ма-лай-цы!» Калі дождж, то звычайна ўсе дзеці скідаюць вопратку, выбягаюць пад дождж, танцуюць і падскокваюць. Настаўніца грае ім марш на аргане, каб было пад што скакаць. Некаторыя становяцца пад вадасцёкавую трубу, каб прыняць сапраўдны душ.

— Ну-ну, — сказала настаўніца, — вельмі цікава.

— Праўда-праўда, — сказала Піпі, — і гэта страх якая добрая школа. Адна з найлепшых у Аўстраліі. Але дужа далёка, на самым поўдні.

— Магу сабе ўявіць, — сказала настаўніца, — у нашай школе дакладна не будзе настолькі вясёлага весялення.

— Шкада, — сказала Піпі, — калі б трэба было толькі бегаць па партах, то я, можа, і наважылася б пабыць з вамі.

— З беганнем пачакай да паходу, — сказала настаўніца.

— А мне з вамі можна? — закрычала Піпі і так узрадавалася, што кульнулася задам наперад з дрэва. — Я вазьму і напішу ім пра гэта ў Аўстралію. Хай яны колькі заўгодна займаюцца сваім весяленнем. А паход усё адно ў сто разоў лепшы.

ПІПІ ІДЗЕ Ў ШКОЛЬНЫ ПАХОД

Шоргат ног па дарозе, шматгалоссе і смех — гэта ішоў Томі з заплечнікам на спіне, ішла і Аніка ў зусім новай паркалёвай сукенцы, і іх настаўніца, ішлі і ўсе дзеці з класа апроч адной небаракі, якой забалела горла акурат у дзень паходу. А наперадзе ехала Піпі на сваім кані. За ёй сядзеў Спадар Нільсан з кішэнным люстэркам у лапцы. Ён пускаў сонечныя зайчыкі і вельмі радаваўся, калі яму ўдавалася трапіць зайчыкам Томі ў вока.

Аніка была абсалютна ўпэўненая, што ў той дзень пойдзе дождж. Яна была настолькі перакананая, што ўжо загадзя амаль сердавала. Але на шчасце — усё-ткі часам шчасціць — сонца працягвала свяціць усё тым жа парадкам, хоць дзень паходу настаў. Сэрца Анікі так і падскоквала ад радасці, калі яна ішла па дарозе ў сваёй навюткай паркалёвай сукенцы. І, дарэчы, усе дзеці выглядалі шчаслівымі

і нецярплівымі. Ускраіны дарогі зараслі вярбой, на якой распусціліся коцікі, а адна палянка, міма якой яны праходзілі, была цалкам пакрытая першацветам.

Дзеці вырашылі назбіраць пук коцікаў і па вялікім букеце першацветаў па дарозе назад.

— Які цудоўны-цудоўны дзень! — усхвалявана ўздыхнула Аніка і падняла вочы на Піпі, якая сядзела на сваім кані з выпраўкай генерала.

— Ага, я гэтак не весялілася з таго дня ў Сан-Францыска, калі баксіравала супраць аднаго цяжкавагавіка, — сказала Піпі. — Хочаш праехацца?

Аніка хацела, і таму Піпі пасадзіла яе на каня перад сабой. Але калі іншыя дзеці гэта ўбачылі, то ім таксама адразу захацелася пакатацца. І іх пакаталі. Строга па чарзе. Праўда, Аніку і Томі пакаталі трошкі даўжэй, чым іншых. І яшчэ была адна дзяўчынка, якая нацёрла ногі. Піпі дазволіла той сядзець за ёй на кані ўвесь час. Але Спадар Нільсан тузаў дзяўчынку за коску штораз, калі дацягваўся.

Канцавым пунктам паходу быў лес, які называўся Страшэнны лес, бо там было страшэнна прыгожа. Калі яны ўжо амаль дайшлі, Піпі саскочыла з сядла і, папляскаўшы каня па боку, сказала:

— Ты так доўга нас вёз, што, мабыць, стаміўся. Так не павінна быць, каб нехта адзін увесь час выжыльваўся.

Моцнымі рукамі яна падняла каня і несла яго, ажно пакуль яны не дайшлі да палянкі ў лесе, дзе настаўніца сказала спыніцца. Піпі аглядзелася і закрычала:

— Ну, страшыдлы, выходзьце ўсе разам, паглядзім, хто тут найдужэйшы!

Але настаўніца растлумачыла ёй, што ніякіх страшыдлаў у лесе няма. Піпі была вельмі расчараваная.

— Страшэнны лес без страшыдлаў! Гэта ж трэба дадумацца! Хутка прыдумаюць вогнішча без агню і карагод вакол ялінкі без ялінкі. Чыста з эканоміі. У той дзень, калі дойдзе да цукерачных крам без цукерак, я пайду і выкажу ім усё. Давядзецца мне самой аддзімацца за страшыдлаў — іншага выйсця я не бачу.

І Піпі так страшна ўзвыла, што настаўніца закрыла вушы, а некалькі дзяцей вельмі напалохаліся.

— Ура! Будзем гуляцца, нібыта Піпі — страшная пачвара! — захоплена закрычаў Томі і запляс-

каў у ладкі. Усе дзеці пагадзіліся з тым, што прапанова выдатная. Пачвара забралася ў глыбокую шчыліну ў скале, вырашыўшы, што тут будзе ейнае логавішча. А дзеці скакалі перад ім, дражніліся і крычалі:

— Дурная пачвара, дурная пачвара!

І тады пачвара выскоквала з гучным рыкам і ганялася за дзецьмі, якія разбягаліся хто куды, каб схавацца. Злоўленых яна цягнула ў логавішча і казала, што зварыць іх на вячэру. Але часам, калі пачвара выходзіла з дома паляваць, ім удавалася ўцячы. Хоць для гэтага даводзілася пралезці па скале, а гэта даволі цяжка. Трымацца можна было толькі за тонкую хваінку, і знайсці апору для ног было няпроста. Але атрымалася дзіка весела, дзеці думалі, што гэта самая здараўская гульня, у якую яны толькі гулялі. Настаўніца ляжала на зялёнай траўцы і чытала кнігу, час ад часу кідаючы позірк на дзяцей.

— Гэта самая дзікая пачвара, якую я толькі бачыла, — прамармытала яна сама сабе.

Так яно і было. Пачвара скакала і завывала і, закінуўшы разам на плячо трох-чатырох

хлопчыкаў, валачыла іх у сваё логавішча. Часам з жахлівай хуткасцю яна забіралася на самае высокае дрэва і перакідалася з галіны на галіну дакладна як малпа, часам скакала на свайго каня і ганялася за тымі дзецьмі, якія спрабавалі ўцячы, бегаючы паміж дрэвамі. Конь нёсся галопам, пачвара нахілялася і, на скаку схапіўшы дзіця, закідала яго перад сабой на каня і наўзгалоп адвозіла да логавішча, завываючы:

— Зараз я звару вас на вячэру!

Было настолькі весела, што дзеці не хацелі заканчваць. Але раптам стала зусім ціха, і калі Томі і Аніка прыбеглі паглядзець, што здарылася, пачвара сядзела на камені і з дзіўным выглядам разглядала нешта, што трымала ў руцэ.

— Яно мёртвае, паглядзіце, яно зусім мёртвае, — сказала пачвара.

Мёртвым было птушаня. Яно выпала з гнязда і забілася.

— Як шкада, — засмуцілася Аніка.

Пачвара кіўнула.

— Піпі, ты што, плачаш? — раптам спытаў Томі.

— Гэта я плачу? — сказала Піпі. — Нічога я не плачу.

— Але ў цябе зусім чырвоныя вочы, — настойваў Томі.

— Чырвоныя вочы, — сказала Піпі, пазычыўшы люстэрка ў Спадара Нільсана, каб паглядзець. — І такія вочы вы называеце чырвонымі? Былі б вы са мной і татам у Батавіі! Там быў адзін дзядуля з такімі чырвонымі вачыма, што паліцыя забараніла яму паказвацца на вуліцах.

— А чаму? — спытаў Томі.

— Бо ўсе думалі, што гэта чырвонае святло святлафора, гэта ж відавочна. Так што, калі ён выходзіў, дарожны рух цалкам спыняўся. Я — і з чырвонымі вачыма?! Не, ты не павінен думаць, што я буду плакаць праз нейкае там птушанятка, — сказала Піпі.

— Дурная пачвара, дурная пачвара!

Адусюль беглі дзеці, каб паглядзець, дзе пачвара. Тады пачвара ўзяла няшчаснае птушаня і вельмі асцярожна паклала яго на мяккі мох.

— Калі б я магла, я ажывіла б яго, — сказала яна, глыбока ўздыхнуўшы, а потым зараўла страшным голасам: — Зараз я звару вас на вячэру!

З радасным піскам дзеці паўцякалі за кусты.

У адной дзяўчынкі — яе звалі Ула — дом быў вельмі блізка ад Страшэннага лесу. Мама Улы дазволіла ёй запрасіць настаўніцу, аднакласнікаў і Піпі на падмацунак у садзе. І таму, калі дзеці нагуляліся ў пачвару, некаторы час палазілі па скале, пазапускалі лодачкі з кары ў вялікай лужыне і праверылі, хто адважыцца саскочыць з высокага валуна, Ула прапанавала пайсці да яе і папіць соку,

бо ўжо, мусіць, быў самы час. І настаўніца, якая прачытала кніжку ад коркі да коркі, думала гэтак жа сама.

Яна сабрала дзяцей, і яны пайшлі са Страшэннага лесу. Па дарозе яны сустрэлі аднаго мужчыну, які ехаў на возе з мяхамі. Мяхі былі цяжкія, і іх было шмат. А конь быў стары і стомлены. Раптам адно кола трапіла ў канаву. Мужчына, якога, дарэчы, звалі Блумстэрлунд, страшна раззлаваўся. Ён вырашыў, што гэта конь вінаваты. Ён дастаў пугу і моцна выцяў каня па спіне. Конь надрываўся і цягнуў, з усіх сіл спрабуючы вывалачы воз на дарогу, але нічога не выходзіла. Блумстэрлунд яшчэ больш раззлаваўся і ўдарыў каня яшчэ мацней. І тут яго ўбачыла настаўніца, яна ледзь не выйшла з сябе ад абурэння, так ёй было шкада беднага каня.

— Як вы можаце здзекавацца з жывёлы? — выказала яна Блумстэрлунду.

Блумстэрлунд ненадоўга адклаў пугу і сплюнуў, перш чым адказаць.

— Не лезьце не ў сваю справу, — сказаў ён. — Бо можа здарыцца, што самі пугі пакаштуеце, усе разам.

Ён сплюнуў яшчэ раз. І зноў узяўся за пугу. Бедны конь увесь закалаціўся. І тут нешта маланкай ірванула праз шэраг дзяцей. Гэта была Піпі. У яе пабялеў нос. А Томі і Аніка ведалі, што калі ў Піпі бялеў нос, гэта значыла, што яна раз'юшаная. Піпі рушыла проста да Блумстэрлунда — і як схопіць яго, як шпурне высока! Калі ён прыляцеў уніз, яна зноў схапіла яго і шпурнула. Чатыры разы, пяць разоў, шэсць разоў кідала яна яго. Блумстэрлунд не разумеў, што яго напаткала.

— Ратунку, ратунку! — спалохана лямантаваў ён.

Нарэшце ён глуха паваліўся на дарогу. Пугу ён згубіў. Піпі стала перад ім рукі ў бокі.

— Больш ты не будзеш біць каня, — рашуча сказала яна. — Каб мне гэтага не рабіў, ясна? Аднойчы ў Кейптаўне я сустрэла іншага дзядзьку, які біў каня. У таго дзядзькі была вельмі чысценькая і прыгожая форма, і я папярэдзіла яго, што калі ён яшчэ раз ударыць свайго каня, я яго так аддубашу, што цэлай ніткі не застанецца ў ягонай форме. Уяві сабе, праз тыдзень ён зноў ударыў свайго каня! Праўда, шкада такой добрай вопраткі?

Блумстэрлунд усё сядзеў на дарозе, зніякавелы.

— Куды ты ехаў на сваім возе? — спытала Піпі.

Блумстэрлунд спалохана паказаў на хату непадалёк.

— Туды, дадому, — сказаў ён.

Тады Піпі абхапіла каня, які ўсё яшчэ дрыжаў ад стомы і страху.

— Ну-ну, конік, — сказала яна, — цяпер для цябе пачнецца іншае жыццё!

Моцнымі рукамі яна падняла яго і аднесла на ягоную стайню. Конь быў гэтак жа здзіўлены, як і Блумстэрлунд.

Дзеці і настаўніца стаялі на дарозе і чакалі Піпі. І Блумстэрлунд, чухаючы галаву, стаяў каля свайго воза. Ён не ведаў, як цяпер давезці яго да дома. Нарэшце вярнулася Піпі. Яна ўзяла адзін з вялікіх цяжкіх мяхоў і пагрузіла яго Блумстэрлунду на спіну.

— Вось так, — сказала яна, — зараз паглядзім, ці такі ты зух цягаць на сабе, як лупцаваць.

Піпі ўзяла пугу.

— Па праўдзе, мне варта трохі прыспешыць цябе вось гэтым, бо табе, відаць, вельмі даспадобы лупцоўка. Але пуга, аёй, трошкі паламалася, —

сказала яна і адламіла кавалачак, — аёй, аёй, зусім-зусім паламалася, — сказала яна і разламала пугу на дробныя-дробныя кавалкі.

Блумстэрлунд павалок мяшок без пярэчання. Толькі соп крыху. А Піпі ўзялася за воз і пацягнула яго да хаты Блумстэрлунда.

— Можаш не дзякаваць, гэта бясплатна, — сказала яна, паставіўшы воз ля стайні. — Я зрабіла гэта з задавальненнем. За шпурлянне таксама можаш не плаціць.

І пайшла. Блумстэрлунд яшчэ доўга стаяў і глядзеў ёй услед.

— Ура, Піпі! — закрычалі дзеці, калі Піпі вярнулася.

Настаўніца таксама была вельмі задаволеная і пахваліла Піпі.

— Ты ўсё правільна зрабіла, — сказала яна. — Трэба быць добрымі з жывёламі. І з людзьмі таксама.

Піпі задаволена сядзела на сваім кані.

— Ды ўжо дакладна, прынамсі, з гэтым дзядзькам я была супердобрая. Дзе ён яшчэ так палётае бясплатна!

— Таму мы і прыйшлі на свет, — працягвала настаўніца, — каб каб быць добрымі і спагадлівымі з іншымі людзьмі.

Піпі стала на галаву на спіне каня і памахала нагамі.

— Хе-хе, — сказала яна, — а іншыя людзі навошта тады прыйшлі?

У садзе Улы стаяў вялікі стол. Там было так шмат булачак і пячэння, што ва ўсіх ажно слінкі пацяклі, і дзеці паспяшаліся размясціцца вакол стала. З аднаго кароткага боку села Піпі. Першае, што яна зрабіла, — узяла дзве булачкі і запхала ў рот. З круглымі, як шары, шчокамі яна зрабілася падобнай да царкоўнага анёлка.

— Піпі, звычайна трэба дачакацца запрашэння, — з дакорам сказала настаўніца.

— Ша мяне не т'эба непакоыцца, — выціснула з сябе Піпі. — Ша мной мошна беш чы'ымоній.

Тут да яе падышла мама Улы са жбанком соку ў адной руцэ і жбанком какавы ў другой.

— Сок ці какаву? — спытала яна.

— Шок і какаву, — сказала Піпі. — Для адной булашкы — шок, а для д'угой — какаву.

Яна ўзяла ў мамы Улы абодва жбанкі і добра з іх сербанула.

— Яна ўсё жыццё гадавалася ў моры, — прашаптала настаўніца маме Улы, якая выглядала аголомшанай.

— Разумею, — кіўнула мама Улы і вырашыла не звяртаць увагі на дрэнныя паводзіны Піпі.

— Імбірнае пячэнне? — сказала яна і працягнула талерку з пячэннем Піпі.

— Ага, быццам бы яно, — сказала Піпі і хіхікнула са свайго жарціку. — Крывенькае, але, спадзяюся, усё адно смачнае, — сказала яна і ўзяла сабе цэлую жменю.

Тут яна ўбачыла, што на стале крыху далей ёсць цудоўнае ружовае пячэнне. Яна злёгку тузанула Спадара Нільсана за хвосцік і сказала:

— Слухай, Спадар Нільсан, зганяй вазьмі мне вунь таго ружовага. Толькі, цур, дзве-тры штукі!

І Спадар Нільсан зганяў праз увесь стол так, што сок ледзь не выліўся са шклянак.

— Спадзяюся, ты падсілкавалася, — сказала мама Улы, калі Піпі падышла да яе падзякаваць напрыканцы.

— Не сказаць, каб надта, ды і піць цяпер хочацца, — сказала Піпі і пачухала вуха.

— Так, мы прапанавалі што маглі, не такі ўжо багаты пачастунак, — сказала мама Улы.

— Ну хоць нешта, — добразычліва сказала Піпі.

Настаўніца вырашыла крыху пагаварыць з Піпі пра паводзіны.

— Паслухай, мілая Піпі, — ласкава сказала яна, — ты ж хочаш зрабіцца вытанчанай і элегантнай дамай, калі вырасцеш?

— Ты маеш на ўвазе такую мадаму з вэлюмам на носе і трыма падбароддзямі? — удакладніла Піпі.

— Я маю на ўвазе заўсёды ветлівую даму, якая паводзіцца прыстойна і трымаецца добрых манер.

— Ёсць тут адна праблемка, — сказала Піпі, — разумееш, фрэкен, я ўжо як бы вырашыла быць піраткай, калі вырасту.

Яна задумалася.

— А ты не думаеш, фрэкен, што можна быць піраткай і Алягантнай Мадамай адначасова? Бо як бы…

Настаўніца не думала, што гэта магчыма.

— А-ёй, а-ёй, што ж мне цяпер выбраць? — маркотна сказала Піпі.

Настаўніца сказала, што які б жыццёвы шлях ні абрала Піпі, ніколі не зашкодзіць навучыцца добрым манерам. Проста нельга так сябе паводзіць, як сёння Піпі за сталом.

— Так складана ведаць, Як Трэба Паводзіцца, — сказала Піпі, цяжка ўздыхнуўшы. — Можаш мне расказаць пра асноўныя правілы?

Настаўніца зрабіла ўсё, што магла. Яна расказвала, а Піпі з цікавасцю слухала, што нельга частавацца, калі цябе яшчэ не запрасілі, нельга браць з талеркі больш за адну пячэньку за раз, нельга есці з нажа, нельга чухацца, калі размаўляеш з іншымі людзьмі, нельга тое і нельга сёе. Піпі задуменна ківала.

— Штораніцы я буду прачынацца на гадзіну раней і трэніравацца, — сказала яна, — каб мне ведаць гэтыя штукі на выпадак, калі я вырашу не быць піраткай.

Непадалёк ад настаўніцы і Піпі на траве сядзела Аніка. Заглыбіўшыся ў свае думкі, яна засунула палец у нос.

— Аніка, — строгім голасам закрычала Піпі, — ты што гэта робіш? Памятай, што Алягантная Мадама калупаецца ў носе толькі тады, калі ніхто не бачыць!

Настаўніца сказала, што час ісці дадому. Дзеці сталі ў радок. Толькі Піпі засталася сядзець на траве. Яна напружана да нечага прыслухоўвалася.

— Што з табой такое, мілая Піпі? — пацікавілася настаўніца.

— Слухай, фрэкен, — сказала Піпі, — а ў Алягантнай Мадамы можа буркатаць у жываце?

Яна сядзела моўчкі і ўсё яшчэ прыслухоўвалася.

— Бо калі не можа, — нарэшце сказала яна, — то мне ўсё-ткі лепей зрабіцца піраткай.

ПІПІ ІДЗЕ НА КІРМАШ

У маленькім гарадку быў кірмаш. Такі кірмаш ладзілі толькі раз на год, і дзеці дзіка радаваліся, калі ён адбываўся. У гэты дзень гарадок выглядаў не так, як звычайна. Паўсюль было не праштурхнуцца ад людзей, віселі сцягі, на плошчы стаялі гандлёвыя шэрагі, дзе можна было купіць дзівосныя рэчы, і столькі вакол было жыцця і мітусні, што нават проста хадзіць па вуліцах было захапляльна.

І найлепшым ва ўсім гэтым было тое, што за мытняй на ўваходзе ў горад ладзілі вялікі парк атракцыёнаў, дзе былі карусель, цір, тэатр і ўсе іншыя магчымыя забавы. Напрыклад, звярынец. Якіх толькі дзікіх жывёл там не было: тыгры, агромністыя змеі, малпы і марскія львы. Стоячы перад звярынцам, можна было пачуць незвычайныя рыкі, такія, якіх больш ніколі ў жыцці не пачуеш. А маючы грошы, можна было пайсці і ўсё-ўсё паглядзець.

Не дзіўна, што ад захаплення ў Анікі трымцеў бант, калі раніцай у дзень кірмаша яна стаяла ўжо цалкам апранутая, а Томі, спяшаючыся, запхаў у рот бутэрброд з сырам ледзь не цалкам.

Мама Томі і Анікі спытала ў сваіх дзяцей, ці не хочуць яны пайсці на кірмаш разам з ёй. Але Томі і Аніка адразу неяк замяліся і сказалі, што калі мама не мае нічога супраць, яны лепей пайшлі б з Піпі.

— Бо ну слухай, — сказаў Томі, звяртаючыся да Анікі, калі яны ўваходзілі праз брамку вілы «Напракудзілы», — па-мойму, з Піпі неяк весялей.

Аніка была абсалютна згодная.

Піпі стаяла пасярод кухні, цалкам гатовая, і чакала іх. Яна нарэшце знайшла свой вялікі, як млыновае кола, капялюш. У скрыні для дроў.

— Я і забыла, што надоечы цягала ў ім дровы, — сказала яна і насунула капялюш на вочы. — Хіба я не алягантная?

Томі і Аніка не маглі адмаўляць, што так. Піпі начарніла бровы вугальком, нафарбавала чырвоным рот і пазногці і надзела вельмі прыгожую сукню, даўжынёй да падлогі. Ззаду сукенкі быў

глыбокі выраз, адкуль вытыркаўся чырвоны гарсаж. З-пад падола вызіралі вялікія чорныя чаравікі, прыгажэйшыя, чым звычайна, бо на іх Піпі завязала зялёныя банцікі, якія выкарыстоўвала толькі для ўрачыстых выпадкаў.

— Думаю, што калі наведваеш кірмаш, трэба выглядаць як Алягантная Мадама, — сказала яна і падыбала па дарозе настолькі элегантна, наколькі гэта наогул было магчыма ў такіх вялікіх чаравіках. Прытрымліваючы падол сукенкі, яна час ад часу прамаўляла голасам, зусім не падобным да яе звычайнага:

— Шыкоўна! Проста шыкоўна!

— Ты пра што зараз? Што шыкоўнае? — спытаў Томі.

— Я, — задаволена адказала Піпі.

Томі і Аніка думалі, што шыкоўнае ўсё, што тычылася кірмашу. Шыкоўна было штурхацца ў натоўпе, і хадзіць на плошчы ад аднаго прылаўка да другога, і разглядаць там размаітыя рэчы. Піпі купіла ў падарунак шаўковы шалік для Анікі, а Томі атрымаў фуражку, пра якую ён даўно марыў, а мама не хацела, каб ён такую насіў. У іншым месцы Піпі купіла два «шкляныя каўпакі» з ружовымі і белымі цукровымі шарыкамі ўнутры.

— Ой, якая ты добрая, Піпі, — сказала Аніка, абдымаючы свой падарунак.

— Ага, проста шыкоўная, — сказала Піпі, падхапіўшы пальцамі падол.

Плынь людзей рушыла з горада за мытню. Піпі, Томі і Аніка пайшлі за імі.

— Як здораўска, — захоплена сказаў Томі.

Грала катрынка, круцілася карусель, чуліся воклічы і смех. Ахвочыя ўжо кідалі дроцікі і стралялі

па талерках. Некаторыя падыходзілі да ціра паказаць сваё майстэрства ў стральбе па мішэнях.

— А на гэта я зірнула б пабліжэй, — сказала Піпі і павяла з сабой Томі і Аніку да ціра.

У пэўны момант людзі каля ціра разышліся, і спадарыня, якая выдавала стрэльбы і збірала грошы, сядзела вельмі панурая. Нейкіх там траіх дзяцей яна не разглядала як кліентуру. Яна не звяртала на іх ніякай увагі. Піпі зацікаўлена разглядала мішэнь — постаць у сінім паліто і з тварам у форме круга. Пасярод твару быў намаляваны чырвоны нос. У гэты нос і трэба было цэліць. А калі не трапляеш у нос, то трэба было спрабаваць трапіць хоць кудысь паблізу. Стрэл міма круга залічваўся як промах.

Урэшце спадарыню пачало раздражняць, што тут стаяць дзеці. Яна хацела, каб прыйшлі пастраляць плацежаздольныя кліенты.

— Усё тут падшываецеся? — злосна сказала яна.

— Ды не, — сур'ёзна адказала Піпі, — мы сядзім на галоўнай плошчы, арэхі трушчым.

— Чаго вочы казеліце? — яшчэ больш злосна сказала спадарыня. — Чакаеце, што нехта прыйдзе і пастраляе?

— Ды не, — адказала Піпі, — мы чакаем, калі ты пакажаш сваё знакамітае сальта-мартале.

І тут нарэшце прыйшла кліентура. Адзін важны спадар з залатым ланцугом на жываце. Узяўшы вінтоўку, ён узважыў яе ў руцэ.

— Узяць хіба пастраляць? — сказаў ён. — Каб хоць паказаць, як трэба.

Ён агледзеўся, каб пабачыць, ці ёсць тут яму якая публіка. Але не было нікога апроч Піпі, Томі і Анікі.

— Глядзіце сюды, дзятва, — сказаў ён, — так і быць, дам вам майстар-клас у стральбе. Вось як гэта робіцца!

Ён прыціснуў вінтоўку да шчакі. Першы стрэл, і-і-і — міма! Другі стрэл — таксама міма. Трэці і чацвёрты — міма і міма. Пяты стрэл закрануў кардонны круг з краёчку.

— Вінтоўка абы-што, — сказаў важны спадар і адкінуў вінтоўку. Піпі ўзяла яе і зарадзіла.

— Во дае дзядзька, а? — сказала яна. — Наступным разам я так і буду рабіць, як дзядзька нас навучыў. А не так во!

— Бах-бах-бах-бах-бах! — пяць стрэлаў трапілі дакладна ў чырвоны нос.

Піпі дала спадарыні ў ціры залатую манету і пайшла.

Карусель была настолькі неверагодная, што калі Томі і Аніка ўбачылі яе, у іх перахапіла дыханне. Можна было катацца на чорных, белых і карычневых драўляных конiках. Конікі мелі сапраўдныя грывы і выглядалі амаль як жывыя. Былі ў іх таксама і сёдлы, і аброці. Піпі панакупляла білетаў на цэлую залатую манету — іх было так шмат, што яны ледзь змяшчаліся ў яе вялікі кашалёк.

— Даклаўшы яшчэ адну залатую манету, я, мусіць, ужо набыла б усю гэтую круцілку-вярцелку, — сказала яна Томі і Аніцы, якія чакалі яе.

Томі выбраў чорнага каня, а Аніка — белага. Спадара Нільсана Піпі пасадзіла на чорнага, самага неўтаймаванага з выгляду. Спадар Нільсан адразу ж пачаў шукаць у каня ў грыве, ці няма там блох.

— А што, Спадар Нільсан таксама паедзе на каруселі? — здзівілася Аніка.

— А як жа, — сказала Піпі, — па добрых развагах, варта было б і майго каня ўзяць. Яму не зашкодзіла б развеяцца. І, ведаеш, конь, які катаецца на кані, — от бы быў ход канём!

Сама Піпі ўскочыла на карычневага коніка, і ўжо праз секунду забрынкала катрынка: «Ах, дзяцінства, ты, дзяцінства, разам спамянём».

«Катацца на каруселі — проста любата», — думалі Томі і Аніка. Здаецца, і Піпі падабалася. Яна перакулілася і стала на кані дагары нагамі. Яе доўгая бальная сукенка звесілася ёй на галаву. Людзі, якія стаялі побач і глядзелі на карусель, бачылі толькі чырвоны гарсаж, зялёныя панталоны і Піпіны цыбатыя ногі ў карычневай і чорнай панчохах і чорных чаравіках, якімі яна гулліва махала туды-сюды.

— Вось так катаюцца на каруселі Алягантныя Мадамы, — сказала Піпі, калі яны пракаціліся першы раз.

Цэлую гадзіну дзеці прысвяцілі каруселі, але нарэшце Піпі дакружылася да таго, што пачала бачыць тры каруселі замест адной.

— Надта ўжо складана вызначыць, на якую трэба лезці, — сказала яна, — таму прапаную пайсці далей.

У яе яшчэ заставалася куча білетаў, і яна аддала іх некалькім малым, якія толькі глядзелі і не маглі пакатацца, бо ў іх не было грошай, каб заплаціць.

Перад намётам паблізу стаяў мужчына і гарланіў:

— Новае прадстаўленне пачынаецца праз пяць хвілін. Ваш шанц убачыць адзіную ў сваім родзе драму «Забойства графіні Аўроры, альбо Хто крадзецца ў кустах?».

— Калі нехта крадзецца ў кустах, мы неадкладна павінны высветліць хто, — сказала Піпі. — Хадзем сюды.

Піпі падышла да акенца касы.

— А можна мне за паўцаны, калі я буду глядзець толькі адным вочкам? — спытала яна ў раптоўным прыступе беражлівасці.

Але касірка і слухаць пра гэта не хацела.

— Нешта я не бачу ні кустоў, ні таго, хто крадзецца ў іх, — незадаволена сказала Піпі, калі яна,

Томі і Аніка ўселіся на самым першым шэрагу перад кулісамі.

— Яшчэ нічога не пачалося, — сказаў Томі.

Тут кулісы раз'ехаліся, і гледачы ўбачылі графіню Аўрору, якая хадзіла туды-сюды па сцэне, заломвала рукі і выглядала вельмі ўстурбаванай. Піпі з вялікай цікаўнасцю назірала за ёй.

— Сто працэнтаў яе штось засмучае, — сказала Піпі Томі і Аніцы. — Альбо ёй недзе шпілька колецца.

Але графіню Аўрору ўсё-ткі нешта засмучала. Яна ўзвяла вочы да столі і залямантавала:

— Ці ёсць няшчаснейшая за мяне? Маіх дзяцей забралі ад мяне, мой муж прапаў, сама я ва ўладзе нягоднікаў і бандытаў, якія хочуць мяне забіць.

— Які кашмар, — сказала Піпі, і ў яе моцна пачырванелі вочы.

— Жадаю я памерлай быць! — выгукнула графіня Аўрора.

Піпі залілася нястрымнымі слязьмі.

— Не кажы так, цё-цёця, — усхліпвала яна. — Усё ж яшчэ можа наладзіцца. Дзяцей, напэўна, можна забраць назад, а дзядзю ты можаш узяць

сабе новага. Іх жа так мно-мно-мно-о-ога, — рыдаючы, казала Піпі.

Падышоў дырэктар тэатра — гэта ён стаяў каля намёта і выкрыкваў запрашэнні — і сказаў Піпі, што калі яна не будзе сядзець ціха, то павінна пакінуць тэатр.

— Я паспрабую, — сказала Піпі і выцерла вочы.

Спектакль быў страшна захапляльны. Томі ад хвалявання ўвесь час круціў і мяў сваю фуражку, Аніка трымала перад сабой сціснутыя кулачкі. У Піпі блішчэлі вочы, яна не спускала іх з графіні Аўроры ні на імгненне. Тым часам справы ў графіні ішлі горай і горай. Не прадчуваючы нічога дрэннага, яна выйшла на шпацыр у замкавы сад. І тут усе пачулі вой. Гэта ўзвыла Піпі. Яна заўважыла мужчыну, які хаваўся за дрэвам і выглядаў нядобрым. Графіня Аўрора, мусіць, таксама нешта пачула — нейкі шоргат, бо яна сказала спалоханым голасам:

— Хто крадзецца ў кустах?

— Я ведаю, — нецярпліва азвалася Піпі, — гэта хітры гадкі дзядзька з чорнымі вусамі. Бяжы хавайся ў хлеў і замкніся на ўсе клямкі!

Да Піпі адразу падышоў дырэктар тэатра і сказаў, што яна павінна пакінуць памяшканне.

— І пакінуць графіню Аўрору адну з гэтым злыднем? Ты кепска мяне ведаеш, — сказала Піпі.

На сцэне працягвалася дзея. Раптам гадкі мужчына выбег з кустоў і схапіў графіню Аўрору.

— Ха! Прыйшоў твой апошні міг, — працадзіў ён скрозь зубы.

— У цябе забылі спытаць, які міг, ага, — сказала Піпі і ў адзін скок апынулася на сцэне.

Яна раз'юшана схапіла нягодніка і выкінула яго з глядацкай залы. Пры гэтым яна рыдала.

— Як ты толькі можаш? — усхліпвала яна. — Што ты наогул уз'еўся на графіню? Яна ж згубіла дзяцей і мужа. І зусім а-адна-а-а!

Яна падышла да графіні, якая бяссільна ўпала на садовую канапу.

— Можаш прыехаць і жыць у мяне на віле «Напракудзіле», — суцешыла яе Піпі.

Спатыкаючыся і гучна рыдаючы, Піпі выйшла з тэатра, за ёй адразу ж — Томі і Аніка. І дырэктар тэатра. Ён трос кулакамі ёй услед. Але публіка

ў тэатры апладзіравала, ім вельмі спадабалася прадстаўленне.

Калі яны адышлі далёка, Піпі высмаркалася ў падол сукенкі і сказала:

— Ох, трэба цяпер развесяліцца, бо гэта было занадта маркотна.

— Звярынец, — сказаў Томі, — мы яшчэ не хадзілі ў звярынец.

І яны пайшлі туды. Праўда, спачатку яны наведалі намёт з бутэрбродамі, дзе Піпі купіла на ўсіх шэсць бутэрбродаў і тры бутэлькі ліманаду.

— Мне заўсёды хочацца есці, калі я паплачу, — сказала Піпі.

У звярынцы было шмат на што паглядзець. Слон і два тыгры ў клетцы, некалькі марскіх львоў, які ўмелі перакідвацца мячыкам адно з адным, вельмі многа малпаў, гіена і дзве агромністыя змяі. Піпі адразу павяла Спадара Нільсана да клеткі з малпамі, каб ён мог павітацца са сваякамі. У клетцы сядзеў стары сумны шымпанзэ.

— Давай, Спадар Нільсан, — сказал Піпі, — павітайся годна! Мяркую, гэта тваёй стрыечнай бабкі родны цётчын дзядзька!

Спадар Нільсан прыўзняў свой саламяны брыль і павітаўся як мага ветлівей. Але шымпанзэ не звярнуў на яго ўвагі і ніяк не адказаў.

Абедзве змяі ляжалі ў вялікай скрыні. Раз на гадзіну іх даставала красуня-заклінальніца фройляйн Паўла, якая дэманстравала іх з памоста. Дзецям пашанцавала. Акурат зараз павінен быў пачацца паказ. Аніка вельмі баялася змей. Яна ўвесь час моцна трымалася за Піпіну руку. Фройляйн Паўла падняла адну змяю, вялікую і страшную, і абматала ёй сабе шыю, як шалікам.

— Здаецца, гэта ўдаў баа, — шапнула Піпі Томі і Аніцы. — Цікава, а якая другая?

Яна падышла да скрыні і дастала другую змяю. Тая была яшчэ большая і жахлівейшая. Піпі абкруціла яе вакол сваёй шыі дакладна як фройляйн Паўла. Усе людзі ў звярынцы закрычалі ад жаху. Фройляйн Паўла сунула сваю змяю ў скрыню і паспяшалася ратаваць Піпі ад немінучай пагібелі. Змяя Піпі напалохалася шуму і раззлавалася. Удаў не мог зразумець, чаму ён павінен вісець на шыі маленькай рудавалосай дзяўчынкі, а не фройляйн Паўлы, як ён прызвычаіўся. Ён

вырашыў правучыць гэтую рудавалосую дзяўчынку і сціснуў яе так, што мог раструшчыць і быка.

— Нават і не спрабуй гэтыя старыя штукі, — сказала Піпі. — Бачыла я і большых змей, павер ты мне. У Індакітаі.

Яна вызвалілася з абдымкаў удава і паклала яго назад у скрыню.

Томі і Аніка стаялі зусім бледныя.

— Гэта таксама баа, — сказала Піпі, зашпільваючы падвязку панчохі, якая адшпілілася. — Дакладна, як я і думала!

Фройляйн Паўла доўга сварылася на нейкай замежнай мове. Усе людзі ў звярынцы выдыхнулі з палёгкай. Але зарана яны выдыхнулі, бо гэта напэўна быў такі дзень, калі шмат што здараецца. Ніхто потым не мог растлумачыць, як жа так выйшла. Тыгры былі пакормленыя вялікімі чырвонымі кавалкамі мяса. І работнік звярынца казаў, што ён дакладна зачыніў дзверы, як належыць. Але праз нейкі час пачуўся страшны крык:

— Тыгр уцёк з клеткі!

Вось што здарылася. Перад звярынцам жоўта-паласаты звер сагнуў лапы, згрупаваўшыся,

і быў гатовы кінуцца. Людзі пабеглі хто куды. Але ў куце проста перад тыграм апынулася маленькая дзячынка.

— Замры і не рухайся! — крычалі ёй.

Людзі спадзяваліся, што тыгр яе не зачэпіць, калі яна не будзе варушыцца.

— Што ж цяпер рабіць? — казалі людзі, заломваючы рукі.

— Выклікаць паліцыю, — паступіла прапанова.

— Пазваніць пажарным, — яшчэ адна прапанова.

— Паклікаць Піпі Доўгую Панчоху, — сказала Піпі і выступіла наперад.

Яна прысела на кукішкі за два метры ад тыгра і павабіла яго:

— Кіс-кіс-кіс!

Тыгр жудасна зарыкаў, паказаўшы страшныя іклы. Піпі паківала ўказальным пальцам.

— Будзеш кусацца, я таксама цябе ўкушу, нават не сумнявайся, — сказала яна.

І тут тыгр кінуўся проста на яе.

— Што такое, ты жартаў не разумееш? — сказала Піпі і шпурнула яго ад сябе.

З рыкам, ад якога ў прысутных кроў застыла ў жылах, тыгр яшчэ раз кінуўся на Піпі. Было відавочна, што ён збіраўся перагрызці ёй горла.

— Ну, як хочаш, — сказала Піпі. — Але ты першы пачаў.

Адной рукой яна сціснула сківіцы тыгра і панесла яго, пяшчотна абдымаючы, назад у клетку, пры гэтым напяваючы пад нос песеньку:

— Ад мяне ён ледзь не ўцёк, мой каток, мой каток.

Другі раз па натоўпе пранёсся выдых палёгкі, а маленькая дзяўчынка, якая была зацiснутая ў куце, пабегла да мамы і сказала, што больш ніколі не хоча хадзіць ні ў які звярынец.

Тыгр падраў Піпіну сукенку ўнізе. Піпі зірнула на падранае і спытала:

— У каго-небудзь ёсць нажніцы?

У фройляйн Паўлы былі, і яна ўжо больш не сердавала на Піпі.

— Трымай, маленькая смяльчачка, — сказала яна і дала Піпі нажніцы.

Піпі ўзяла іх і абрэзала сваю сукенку вышэй за калені.

— Вось так, — задаволена сказала яна, — так яшчэ больш алягантна. Выраз зверху і выраз знізу, алягантней няма куды.

І яна падыбала да такой ступені элегантна, што каленкі ўдараліся адна аб адну пры кожным яе кроку.

— Проста шыкоўна, — прыгаворвала яна пры хадзе.

Можна было б падумаць, што зараз на кірмашы надыдуць ціша і спакой. Але на кірмашы

ніколі не бывае спакойна — хутка зрабілася ясна, што і гэтым разам зарана было выдыхаць.

У маленькім гарадку быў адзін буян, дужа моцны. Яго баяліся ўсе дзеці. І не толькі дзеці, дарэчы. Усе яго баяліся. Нават паліцэйскія ахвотна не паказваліся на вуліцах, калі буян Лабан выходзіў на сцяжыну вайны. Ён не ўвесь час буяніў, а толькі калі напіваўся піва. І ў дзень кірмаша ён напіўся.

З гырканнем і лаянкай ён выйшаў на Стургатан, размахваючы рукамі.

— Прэч з дарогі, вошы, — крычаў ён, — Лабан ідзе!

Асцерагаючыся, людзі прыціскаліся да сцен дамоў, а многія дзеці заплакалі ад страху. Паліцыя не паказвалася. Пакрысе Лабан выйшаў за мытню. З выгляду ён быў жахлівы: на лбе — доўгія чорныя пасмы, нос чырвоны, з рота залаты зуб тырчыць. Людзі, якія сабраліся ля мытні, думалі, што ён горшы за тыгра.

Адзін худзенькі дзядуля там прадаваў каўбаскі. Лабан падышоў да яго, ударыў кулаком аб прылавак і закрычаў:

— Каўбасіну мне! І варушыся хутчэй!

Дзядуля адразу працягнуў каўбаску.

— З вас дваццаць пяць эрэ, — сціпла сказаў ён.

— Яшчэ і грошы дзярэш за каўбасу? — сказаў Лабан. — Абслугоўваючы такога крутога, як я! А ты дзёрзкі, дзед! Ану, гані яшчэ адну каўбасіну!

Дзядуля сказаў, што спачатку хацеў бы атрымаць плату за тую, што Лабан ужо ўзяў. Тады Лабан схапіў дзядулю за вушы і патрос.

— Каму сказаў, гані каўбасіну! — завыў ён. — Мігам!

Дзядуля не насмеліўся запярэчыць і зрабіў, як патрабаваў Лабан. Але людзі вакол незадаволена зашумелі. Нехта нават адважыўся сказаць:

— Як не сорамна так паводзіцца з бедным дзядулем!

Тут Лабан павярнуўся. Ён паглядзеў на ўсіх сваімі налітымі крывёю вачыма.

— Хтось кашлянуў нешта? — сказаў ён.

Людзі напалохаліся і хацелі разысціся.

— Стаяць, — зароў Лабан, — першаму, хто варухнецца, кацялок разаб'ю. Стаяць, я сказаў! Зараз вам Лабан пакажа штукі!

З гэтымі словамі ён загроб цэлую жменю каўбасак і пачаў імі жангліраваць. Ён падкідаў каўбаскі ўверх і лавіў некаторыя ротам, а некаторыя рукамі, але шмат пападала на зямлю. Бедны прадавец каўбасак ледзь не плакаў. І тут з натоўпу выйшла маленькая постаць. Піпі стала проста перад Лабанам.

— А чый гэта жэўжык? — ласкава сказала яна. — А што яму кажа матуля, калі ён вось так раскідае вакол сябе ежу?

Лабан жудасна зароў:

— Я што сказаў? Стаяць усім, не рухацца!

— Ты заўжды настройваеш дынамік, каб чуваць было за мяжой? — пацікавілася Піпі.

Лабан пагрозліва ўзняў кулак і закрычаў:

— Малая!!! Мне прыбіць цябе, каб ты замоўкла?

Піпі стаяла рукі ў бокі і зацікаўлена глядзела на яго.

— Як гэта ты з каўбасой абыходзіўся? — сказала яна. — Вось так?

Яна высока падкінула Лабана і шпурляла яго ўверх штораз, калі ён прылятаў назад. Людзі трыумфавалі. Прадавец каўбасак пляскаў у маленькія маршчыністыя далоні і ўсміхаўся.

Калі Піпі скончыла, вельмі напалоханы Лабан сядзеў на зямлі і збянтэжана азіраўся.

— Думаю, буяну пара дадому, — сказала Піпі.

Лабан быў не супраць.

— Але спачатку трэба заплаціць за каўбаскі, — сказала Піпі.

Тады Лабан падняўся і заплаціў за васямнаццаць каўбасак. І потым ён пайшоў, ні слова не сказаўшы. Пасля гэтага дня ён ужо ніколі не паводзіўся як раней.

— Няхай жыве Піпі! — закрычалі людзі.

— Ура, Піпі! — далучыліся Томі і Аніка.

— Нам і паліцыя не патрэбная, — сказала адна кабета, — пакуль у нас ёсць Піпі Доўгая Панчоха.

— Сапраўды, — падтрымалі яе, — Піпі знаходзіць управу і на тыграў, і на буянаў.

— Паліцыя да зарэзу патрэбная, — сказала Піпі. — Трэба ж камусьці сачыць за тым, каб усе ровары былі прыпаркаваныя няправільна.

— Ой, Піпі, ты такая класная, — сказала Аніка, калі дзеці шыбавалі дадому з кірмаша.

— Ага, проста шыкоўная, — сказала Піпі.

Яна прыўзняла пальцамі падол караценечкай сукенкі.

— У чыстым выглядзе шыкардос!

ПІПІ ЦЯРПІЦЬ КАРАБЛЕКРУШЭННЕ

Штодня, калі заканчваліся школьныя заняткі, Томі і Аніка несліся на вілу «Напракудзілу». Дома яны нават хатнія заданні не хацелі рабіць, а бралі з сабой падручнікі да Піпі.

— Гэта добра, — сказала Піпі. — Сядзіце тут і вучыцеся, мо да мяне таксама прыстане крыху вучэння. Не тое, каб я адчувала вострую патрэбу, але, напэўна, Алягантнай Мадамай не стаць без таго, каб вывучыць колькасць карэннага насельніцтва ў Аўстраліі.

Томі і Аніка сядзелі за кухонным сталом з разгорнутымі падручнікамі геаграфіі. А Піпі сядзела на стале, падклаўшы пад сябе ногі.

— Хоць я вось думаю, — сказала Піпі, задумена прыціснуўшы палец да носа, — напрыклад, вось толькі я вывучыла колькасць насельніцтва, а нехта з насельніцтва вазьмі і памры ад запалення лёгкіх — і ўсё кату пад хвост, сяджу я, і ні разу

не Мадама. Нехта мусіць перадаць насельніцтву, каб паводзіліся так, каб у падручніках не было памылак, — разважыла яна.

Калі Томі і Аніка заканчвалі рабіць урокі, пачыналася ўсякая весялосць. У добрае надвор'е можна было пайсці ў сад, пакатацца на кані ці залезці на дах каморы для прасавальнага катка і папіць там кавы, ці можна было ўскараскацца на стары дуб і залезці ў дупло. Піпі казала, што гэта вельмі незвычайнае дрэва — у ім раслі бутэлькі з ліманадам. Проста ўнутры камля.

Напэўна, гэта была праўда, бо штораз, як дзеці спускаліся праз дупло ўнутр дуба, яны знаходзілі там тры бутэлькі ліманаду. Томі і Аніка ніяк не маглі спасцігнуць, куды потым дзяваюцца пустыя бутэлькі, але Піпі сцвярджала, што яны адцвітаюць, калі іх выпіваеш. Сапраўды, дрэва было незвычайнае, з гэтым Томі і Аніка былі згодныя. Часам там таксама расло шакаладнае пячэнне, але, паводле слоў Піпі, толькі па чацвяргах, таму Томі і Аніка дастаткова ўпэўнена лазілі туды шточацвер на збор ураджаю. Піпі казала, што калі час ад часу паліваць дрэва як след, могуць

вырасці французскія булачкі і нават трошкі смажаніны з цяляціны.

У дажджлівае надвор'е трэба было заставацца дома, і гэта таксама было нясумна. Напрыклад, можна было разглядаць усякія цудоўныя штучкі ў шуфлядках Піпінай камоды, альбо сесці каля печкі і глядзець, як Піпі пячэ вафлі ці запякае яблыкі, альбо залезці ў скрыню для дроў і, седзячы там, слухаць аповеды Піпі пра захапляльныя прыгоды з тых часоў, калі яна плавала па морах і акіянах.

— Проста гамон, які быў шторм, — магла сказаць Піпі. — Нават рыб загайдала, і яны хацелі выйсці на зямлю. Я на свае вочы бачыла акулу, якая пазелянела тварам, і васьміногa, які трымаўся за лоб усімі сваімі шчупальцамі. Во як штарміла!

— А ты не баялася, Піпі? — пытала Аніка.

— Ага, вы ж маглі трапіць у караблекрушэнне, — дадаў Томі.

— Ды не, — сказала Піпі. — Я караблекрушалася столькі разоў, што не баялася. Прынамсі, не так проста было мяне напалохаць. Я не спужалася, калі за вячэрай разынкі выскачылі з кампота і ў кока выдзьмула ветрам з рота ўстаўныя зубы. Але калі я ўбачыла, што з карабельнага ката дзьмула

поўсць і ён нясецца ў паветры на Далёкі Усход, вось тады мне стала неяк не па сабе.

— У мяне ёсць кніжка пра караблекрушэнне, — сказаў Томі, — называецца «Рабінзон Круза».

— О так, яна добрая, — сказала Аніка. — Там жа гэты Рабінзон трапляе на ненаселеную выспу.

— А ты, Піпі, калі-небудзь трапляла на ненаселеную выспу пасля караблекрушэння? — спытаў Томі і ямчэй усеўся ў скрыні для дроў.

— Яшчэ як трапляла, — сказала Піпі, — ого-го як. Такіх пацярпелых на караблекрушэнні яшчэ трэба пашукаць. Рабінзон проста адпачывае. Думаю, што ў Атлантыцы і Ціхім акіане засталося мо толькі восем-дзесяць выспаў, куды я не караблекрушалася. Усе яны ў адмысловым чорным спісе ў турыстычных дапаможніках.

— Класна, мабыць, трапіць на ненаселеную выспу, — сказаў Томі. — Я б таксама вельмі хацеў.

— Гэта лёгка, — сказала Піпі. — У выспах нястачы няма.

— Я, дарэчы, ведаю адну паблізу, — сказаў Томі.

— Выспу ў вадзе? — удакладніла Піпі.

— А як жа, — пацвердзіў Томі.

— Цудоўна, — сказала Піпі, — бо выспе на сушы грош цана.

Томі проста ўзвіўся ад захаплення.

— Дык давайце выправімся туды! — закрычаў ён. — Як мага хутчэй!

Праз два дні ў Томі і Анікі пачыналіся летнія канікулы, а мама з татам адпраўляліся ў падарожжа. Лепшага выпадку для таго, каб пагуляцца ў рабінзонаў, немагчыма было і прыдумаць.

— Хочаш пацярпець караблекрушэнне — спачатку правер, ці ёсць у цябе карабель, — сказала Піпі.

— А ў нас няма, — сказала Аніка.

— Я тут бачыла: непадалёк на дне ракі ляжыць старая дзіравая лодка, — сказала Піпі.

— Але яна ўжо пацярпела караблекрушэнне, — сказала Аніка.

— Яшчэ лепш, — сказала Піпі, — яна ўжо ведае, як гэта робіцца.

Для Піпі не было нічога лягчэйшага, чым выцягнуць патанулую лодку на бераг ракі. Потым яна цэлы дзень рамантавала корпус, затыкаючы

дзіры пры дапамозе дзёгцю і пакулля. А адной дажджлівай раніцай вычасала сякерай пару вёслаў.

І вось надышлі летнія канікулы Томі і Анікі, а іх бацькі сабраліся ў дарогу.

— Мы вернемся праз два дні, — сказала дзецям мама. — Будзьце добрымі і паслухмянымі і памятайце, што вы павінны ўсё рабіць, як скажа Эла.

Эла працавала ў сям'і пакаёўкай і мусіла прыглядаць за Томі і Анікай, пакуль іх мама і тата былі ў ад'ездзе.

Але як толькі бацькі паехалі, Томі сказаў:

— Эле зусім не трэба за намі прыглядаць, бо мы ж увесь час будзем у Піпі.

— Мы, дарэчы, самі можам за сабой прыглядзець, — дадала Аніка. — За Піпі ніколі ніхто не прыглядае. Чаму нам не дазваляюць пабыць у спакоі хоць два дні?

Эла не мела нічога супраць таго, каб адпачыць пару дзён, і калі Томі і Аніка, прыстаўшы, як смала, пахадзілі за ёй з просьбамі дастаткова доўга, Эла нарэшце сказала, што напэўна можа паехаць дадому наведаць маму. Але тады дзеці павінны паабяцаць, што будуць есці і спаць належным чынам, а па вечарах не будуць бегаць на дварэ без

цёплых швэдараў. Томі сказаў, што хоць дзесяць швэдараў надзене, абы Эла паехала.

Так і дамовіліся. Эла знікла, і ўжо праз дзве гадзіны Піпі, Томі, Аніка, конь і Спадар Нільсан выправіліся на ненаселеную выспу.

Быў вечар ранняга лета. Паветра было цёплае, хоць вісела смуга. Да возера, у якім была ненаселеная выспа, дарога ляжала няблізкая. Піпі несла перавернутую лодку над галавой. На спіну каня яна пагрузіла вялікі мех і намёт.

— А што ў меху? — спытаў Томі.

— Правіянт, агнястрэльная зброя, коўдры і пустая бутэлька, — сказала Піпі. — Бо паколькі для вас гэта першае караблекрушэнне, думаю, яно павінна быць камфартабельным. Звычайна калі я караблекрушуся сама, то падстрэльваю антылопу альбо ламу і харчуюся сырым мясам, але, імаверна, на гэтым востраве не водзяцца антылопы і ламы, то не паміраць жа з голаду праз такую дробязь.

— Навошта табе пустая бутэлька? — пацікавілася Аніка.

— Навошта мне пустая бутэлька? Дурное пытанне! Ясна, што ў справе караблекрушэння

найважнейшае — гэта карабель, але наступнае па важнейшасці — гэта пустая бутэлька. Гэтаму мяне навучыў бацька, калі я яшчэ ляжала ў калысцы. «Піпі, — сказаў ён, — нічога страшнага, калі ты забудзеш памыць ногі, збіраючыся быць прадстаўленай пры каралеўскім двары, але калі ты забудзеш пустую бутэльку перад караблекрушэннем, пішы прапала».

— Ясна, але не ясна, навошта яна, — не суніма-лася Аніка.

— Ты што, ніколі не чула пра бутэлечную пошту? — сказала Піпі. — Пішаш на паперцы «ратунку!», засоўваеш у бутэльку, закаркоўваеш і выкідаеш бутэльку ў мора, і яна адразу плыве да тых, хто можа цябе ўратаваць. А ты думала, як уратоўваюцца пасля караблекрушэння? Спадзявацца на чыстае шанцаванне? Э, не-е!

— Ага, вось навошта, — сказала Аніка.

Неўзабаве яны прыйшлі да маленькага возера, і пасярод яго ляжала ненаселеная выспа. Сонца вызірнула з-за воблака і прыветна асвятліла светла-зялёную летнюю лістоту.

— Напраўду, — сказала Піпі, — гэта адна з самых сімпатычных ненаселеных выспаў, якія я толькі бачыла.

Яна спрытна спусціла лодку на ваду, зняла з каня ягоную паклажу і пагрузіла ўсё на дно лодкі. Аніка, Томі і Спадар Нільсан заскочылі ў лодку. Піпі папляскала каня па баку.

— Даражэнькі конь, як бы мне ні хацелася, я не магу запрасіць цябе ў лодку. Спадзяюся, ты ўмееш плаваць. Гэта вельмі проста. Робіш вось так.

Яна плюхнулася ў возера проста ў вопратцы і зрабіла некалькі грабкоў.

— Гэта страшна весела, павер ты мне. А калі хочаш, каб было яшчэ весялей, можаш гуляцца ў кіта. Вось так!

Піпі набрала ў рот вады, перавярнулася на спіну і выпусціла фантанчык.

Па кані не было заўважна, каб ён лічыў плаванне нейкім вясёлым заняткам, але калі Піпі села ў лодку, узялася за вёслы і пагрэбла, конь зайшоў у ваду і паплыў за ёй. У кіта ён, што праўда, не гуляўся. Калі яны амаль даплылі да выспы, Піпі закрычала:

— Прабоіна! Усе да помпаў!

І ўжо праз секунду:

— Марна! Пакінуць судна! Ратуйся хто можа!

Яна паднялася на заднім сядзенні і кінулася галавой у ваду. Хутка яна вынырнула, ухапіла ратавальны канат лодкі і паплыла да берага.

— Мне ўсё адно трэба выратаваць мяшок з ежай, так што экіпаж можа заставацца на борце, — сказала яна.

Прывязаўшы лодку за валун, яна дапамагла Томі і Аніцы выбрацца на бераг. Спадар Нільсан даў рады самастойна.

— Адбыўся цуд! — закрычала Піпі. — Мы ўратаваныя! Прынамсі, да пары да часу. Пакуль тут няма канібалаў і львоў.

Конь таксама даплыў да выспы. Ён выйшаў з вады і абтросся.

— Глядзіце, і памочнік капітана тут як тут, — задаволена сказала Піпі. — Давайце трымаць ваенную раду.

Яна дастала з мяшка пісталет, які неяк знайшла на гарышчы вілы «Напракудзілы» ў марацкім куфры. З пісталетам у руцэ Піпі пракралася з разведкай, уважліва разглядаючыся.

— Ты чаго, Піпі? — устурбавана спытала Аніка.

— Здаецца, я чула рык канібала, — сказала Піпі. — Ніколі нельга губляць пільнасці. Не хапала яшчэ, уратаваўшыся ад патаплення, трапіць канібалам на вячэру разам з тушанай гароднінай!

Але ніякіх канібалаў не было выяўлена.

— Ха, яны адступілі і заселі ў засадзе, — сказала Піпі. — Альбо мо вывучаюць кулінарную кнігу, каб зразумець, як трэба нас гатаваць. Я скажу так: хай толькі паспрабуюць падаць мяне з тушанай морвай, гэтага я ім ніколі не дарую. Цярпець не магу моркву!

— Б-р-р, Піпі, не кажы такога, — сказала Аніка і здрыганулася.

— А што такое? Таксама не любіш моркву? Ну, як скажаш. А зараз трэба паставіць намёт.

І Піпі занялася гэтым. Хутка намёт ужо стаяў на бяспечным месцы, і абсалютна шчаслівыя Томі і Аніка лазілі туды-сюды. Непадалёк ад намёта Піпі выклала кругам камяні і назбірала туды палачак і трэсак.

— О, як цудоўна, у нас будзе вогнішча, — сказала Аніка.

— Будзе-будзе, — сказала Піпі.

Яна ўзяла два кавалкі дрэва і пачала церці імі адзін аб другі. Томі быў заінтрыгаваны.

— Ого, Піпі, — захопена сказаў ён, — ты што, збіраешся развесці агонь па-першабытнаму?

— Не, проста мне пальцы мерзнуць, — сказала Піпі, — а так добра саграешся, не горш, чым калі расціраешся і пляскаеш па сабе рукамі. Куды гэта я паклала запалкі?

Хутка ўжо весела гарэла вогнішча, Томі сказаў, што вельмі па-дамашненькаму.

— Ага, і дзікія звяры будуць трымацца на адлегласці, — дадала Піпі.

Аніка вохнула.

— Якія дзікія звяры? — спытала яна дрыготкім голасам.

— Камары, — адказала Піпі і задуменна пачасала вялікі пухір ад камарынага ўкусу на назе.

Аніка ўздыхнула з палёгкай.

— І львы, — дадала Піпі, — але ад пітонаў і амерыканскіх бізонаў вогнішча не дапамагае.

Яна папляскала па пісталеце.

— Спакойна, Аніка, — сказала яна, — з гэтай штукай я з любой небяспекай разбяруся, нават калі прыйдзе мыш-палёўка.

Піпі зварыла каву і дастала бутэрброды. Пасеўшы вакол вогнішча, дзеці елі, пілі і пачуваліся проста дзівосна. Спадар Нільсан, уладкаваўшыся на плячы ў Піпі, таксама сілкаваўся, і конь час ад часу працягваў пысу і атрымліваў кавалачкі хлеба і цукру. Таксама ў яго быў цэлы лужок цудоўнай зялёнай травы вакол, якую ён мог скубці.

Неба закрыла смуга, і ў кустах зусім сцямнела. Аніка перасунулася як мага бліжэй да Піпі. Языкі полымя адкідалі дзіўныя цені. Падавалася, што цемра там, за маленькім асветленым вогнішчам кругам, была жывая. Аніка скалянулася. А што, калі за тым кустом хаваўся канібал? Ці леў затаіўся за тым валуном?

Піпі адставіла ўбок свой кубак.

Пятнаццаць чалавек на куфар мерцвяка,
ё-хо-хо і бутэлька рому, —
заспявала яна хрыпатым голасам.

Аніка яшчэ больш задрыжала.

— Гэтая песня ёсць у іншай маёй кнізе, — узрадаваўся Томі, — у «Пірацкай кнізе».

— Яшчэ б ёй там не быць, — сказала Піпі. — Яе ж Фрыдальф напісаў, бо гэта ад яго я навучылася. Колькі разоў зорнымі начамі, калі Паўднёвы Крыж вісеў проста над маёй галавой, сядзела я на карме татавага карабля, а Фрыдальф насупраць мяне спяваў вось так:

Пятнаццаць чалавек на куфар мерцвяка,
ё-хо-хо і бутэлька рому, —

зноў заспявала Піпі яшчэ больш хрыпатым голасам.

— Піпі, я так дзіўна пачуваюся, калі ты так спяваеш, — сказаў Томі. — Неяк страшна і класна адначасова.

— А мне толькі страшна, — сказала Аніка. — Хоць трошачкі класна таксама.

— Калі я вырасту, то выпраўлюся ў мора, — перакананa сказаў Томі. — Я таксама буду піратам, дакладна як ты, Піпі.

— Цудоўна, — сказала Піпі. — Жах Карыбскага мора — гэта будзем мы з табой, Томі. Нарабуем золата, упрыгажэнняў і каштоўных камянёў і будзем захоўваць нашы скарбы ў пячоры на ненаселенай

выспе ў Ціхім акіяне, пячору будуць ахоўваць тры шкілеты, у нас будзе сцяг з чэрапам і дзвюма скрыжаванымі косткамі, будзем спяваць «Пятнаццаць чалавек на куфар мерцвяка» так, што будзе чутно на абодвух канцах Атлантыкі, і ўсе іншыя піраты збляднеюць з твару, калі пачуюць, і захочуць кінуцца ў мора, каб пазбегнуць нашай крывавай-крывавай помсты.

— А як жа я? — жаласна сказала Аніка. — Я баюся быць піраткай. І што мне тады рабіць?

— Ты можаш проста так з намі паехаць, — сказала Піпі. — І працiраць пыл на фартэп'яне.

Паступова вогнішча патухла.

— Пара спаць, — сказала Піпі.

Унутры намёта яна пасцяліла яловых лапак, а на іх — некалькі цёплых коўдраў.

— Хочаш спаць са мной валецікам у намёце? — спытала Піпі ў каня. — Ці ты лепш пастаіш пад дрэвам, а я цябе накрыю посцілкай? Кажаш, што цябе заўжды нудзіць, калі ты ляжыш у намёце? Ну то як пажадаеш! — Піпі ласкава папляскала яго па баку.

Хутка ўсе трое дзяцей і Спадар Нільсан ляжалі ў намёце, закруціўшыся ў коўдры. Знадворку хвалі плёскалі аб бераг.

— Як на акіяне, — сонна сказала Піпі.

Было цёмна, як у коміне, і Аніка трымала Піпі за руку, бо тады ўсё здавалася не такім небяспечным. Нечакана пайшоў дождж. Кроплі білі па тканіне намёта, але ўнутры было цёпла і суха, і было так прыемна слухаць гэты шум. Піпі выйшла і накрыла каня яшчэ адной посцілкай. Ён стаяў пад густой ялінай, таму пра яго можна было не хвалявацца.

— Як жа нам класна, — радасна ўздыхнуў Томі, калі Піпі вярнулася.

— Яшчэ б! — сказала Піпі. — І глядзіце, што я знайшла пад каменем! Шакаладнае пячэнне, тры штукі!

Праз пару хвілін, трымаючы Піпіну руку, Аніка заснула з поўным шакаладу ротам.

— Мы сёння забылі пачысціць зубы — сказаў Томі і таксама заснуў.

Калі Томі і Аніка прачнуліся, Піпі побач не было. Яны хутчэй вылезлі з намёта. Свяціла сонца. Перад намётам зноў гарэла вогнішча, а ля агню сядзела Піпі, смажыла шынку і варыла каву.

— Хто хоча праглынуць смяшынку? — сказала яна, убачыўшы Томі і Аніку.

— Зараз жа не першага красавіка, — сказаў Томі.

— Вось як, — адказала Піпі, — тады давядзецца глытаць шынку.

Прыемны пах шынкі і кавы казытаў дзецям насы. Яны селі вакол вогнішча, скрыжаваўшы ногі, і Піпі перадала ім шынку, яйкі і дала па бульбіне. Потым яны пілі каву з імбірным пячэннем. І ніколі сняданак не смакаваў так цудоўна.

— Мне здаецца, што нам больш здараўска, чым было Рабінзону, — сказаў Томі.

— Калі ўдасца налавіць свежай рыбы на абед, баюся, што Рабінзон пазелянее ад зайздрасці, — сказала Піпі.

— Фу, не люблю рыбу, — сказаў Томі.

— І я не люблю, — сказала Аніка.

Але Піпі зрэзала доўгі вузкі дубчык, прывязала да аднаго канца матузок, сагнула кручок са шпількі, насадзіла на кручок маленькі камяк хлеба і села на валун на беразе вудзіць.

— Зараз паглядзім, — сказала яна.

— А каго ты хочаш злавіць? — спытаў Томі.

— Каракаціцу, — сказала Піпі. — Няма нічога смачнейшага за яе.

Яна прасядзела так цэлую гадзіну, але каракаціца не бралася.

Прыплыў акунь і хацеў панюхаць хлебны камячок, але тады Піпі хуценька выцягнула лёску.

— Дзякуй, дружа, але не, — сказала яна. — Гляджу, што рыбалка не задалася. Каракаціца сёння капрызіць.

Томі і Аніка былі вельмі задаволеныя. Вада вельмі прывабна блішчэла ў сонечным святле.

— Будзем купацца? — спытаў Томі.

Піпі і Аніцы прапанова спадабалася. Вада была вельмі халодная. Томі і Аніка памачылі пальцы ног і хуценька выцягнулі.

— Я ведаю лепшы спосаб, — сказала Піпі.

Каля самага берага была строма, дзе расло дрэва, галіны якога навісалі над вадой. Піпі залезла на дрэва і моцна прывязала да адной галіны вяроўку.

— Глядзіце, вось так!

Схапіўшыся за вяроўку, яна адштурхнулася і паляцела на вяроўцы ў ваду.

— Так цалкам акунаешся, — крыкнула яна, калі вынырнула.

Томі і Аніка спачатку крыху вагаліся, але выглядала так весела, што яны вырашылі паспрабаваць. І, паспрабаваўшы раз, ужо не хацелі заканчваць, бо аказалася, што гэта яшчэ весялей, чым выглядае. Спадар Нільсан таксама так хацеў. Ён ляцеў уніз на вяроўцы, але за імгненне да таго, як плёснуцца ў ваду, шалёна хутка ўзбіраўся ўгару. Так ён рабіў штораз, хоць дзеці крычалі яму, што ён баязлівец. Потым Піпі высветліла, што можна было садзіцца на дошку і з'язджаць на ёй са скалы ў ваду, і гэта таксама было весела, плёскала проста ашалямляльна.

— А гэты Рабінзон, ён хоць катаўся на якім кавалку дошкі? — пацікавілася Піпі, седзячы высока на скале, гатовая з'ехаць.

— У кніжцы, прынамсі, пра гэта нічога няма, — сказаў Томі.

— Так і я ведала. Думаю, што ягонае караблекрушэнне было абы-што. Як ён хоць бавіўся цэлымі днямі? Крыжыкам вышываў? У-ух, я паехала!

Піпі слізганула, і яе рудыя коскі маланкай мільганулі за ёй.

Пасля купання дзеці вырашылі як мае быць даследаваць ненаселеную выспу. Усе ўтраіх яны селі на каня, і ён паслухмяна патрусіў наперад. Ён вёз іх на горку і з горкі, праз лясныя зарасці, паміж густых ялін, міма балота і праз гожыя палянкі,

зарослыя краскамі. Піпі трымала пісталет напагатове і час ад часу пуляла з яго так, што конь высока падскокваў ад жаху.

— Гатовенькі! Гэта быў леў, — задаволена казала яна.

Ці вось так:

— Даскакаўся, каніба́л!

— Мне здаецца, гэта заўсёды будзе наша выспа, — сказаў Томі, калі яны вярнуліся на сваю стаянку і Піпі ўзялася пячы бліны з шынкай.

Піпі і Аніка былі згодныя з Томі.

Бліны з шынкай надта смакуюць, калі іх есці толькі што спечанымі. Ніякіх талерак, відэльцаў ці сталовых нажоў не было, і Аніка спытала:

— А можна есці рукамі?

— Я абсалютна не супраць, — адказала Піпі. — Але сама буду есці дзедаўскім спосабам — ротам.

— Ай, ну ты ж разумееш, што я маю на ўвазе, — сказала Аніка.

Яна ўзяла сваёй маленькай ручкай блін і з вялікім задавальненнем запхала яго ў рот.

І вось зноў надышоў вечар. Вогнішча пагасла. Шчыльна прыціснуўшыся адно да аднаго, з тварамі, перамазанымі блінамі з шынкай,

дзеці ўлегліся пад коўдры. Праз дзірку ў намёце свяціла вялікая зорка. Іх закалыхваў шум акіянскага прыбою.

— Сёння нам трэба дадому, — паныла сказаў Томі наступнай раніцай.

— Што за прыкрасць, — бедавала Аніка. — Я хацела б прабавіць тут усё лета. Але сёння вяртаюцца мама і тата.

Пасля сняданку Томі выйшаў на шпацыр па беразе. І раптам страшна закрычаў. Лодка! Яна прапала! Аніка была проста агаломшаная. Як жа яны выберуцца адсюль? Ёй безумоўна хацелася прабавіць на выспе ўсё лета, але зусім інакш пачуваешся, калі ведаеш, што вярнуцца дадому не можаш. І што скажа бедная мама, калі ўбачыць, што Томі і Аніка прапалі?! У Анікі выступілі слёзы на вачах, калі яна ўявіла сабе гэта.

— Што з табой, Аніка? — спытала Піпі. — Як ты ўрэшце разумееш караблекрушэнне? Што, ты думаеш, сказаў бы Рабінзон, калі б пабыў на сваёй ненаселенай выспе толькі пару дзён — і тут па яго ўжо прыплыў бы параход? «Прашу на борт, спадар Круза, зараз будзем вас ратаваць-мыць-галіць

і пастрыжом вам пазногці на нагах!» — «О, то дзякуй, не трэба», — сказаў бы ён! Вось павер, што спадар Круза ўцёк бы і схаваўся за кустом. Бо калі табе пашанцавала трапіць на ненаселеную выспу, то хочацца пабыць там хаця б гадоў сем.

Сем гадоў! Аніка скаланулася, а Томі глыбока задумаўся.

— Натуральна, мы не будзем заставацца тут бясконца, — суцяшальна сказала Піпі. — Калі Томі ў свой час прызавуць у войска, дык што ўжо тады, давядзецца вяртацца.

Аніка адчайвалася ўсё болей. Піпі глядзела на яе, разважаючы.

— Не, ну калі ты так гэта ўспрымаеш, — сказала яна, — то не застаецца нічога іншага, як адправіць ліст у бутэльцы.

Пакорпаўшыся ў мяху, яна выцягнула адтуль пустую бутэльку. Папера і аловак таксама шчаслі-ва адшукаліся. Усё гэта яна выклала на камень перад Томі.

— Пішы, пісарчук, ты на гэтым лепш знаешся, — сказала яна.

— А што пісаць? — спытаў Томі.

— Зараз-зараз, — сказала Піпі, раздумваючы, — значыцца, можна напісаць так:

«Ратуйце нас з выспы, покі мы не сканалі! Без тытуню нам тут каюк праз два дні».

— Піпі, мы не можам так напісаць, — з дакорам сказаў Томі. — Гэта ж няпраўда.

— Што менавіта? — удакладніла Піпі.

— Не можам мы пісаць «без тытуню», — сказаў Томі.

— Чаму? — спытала Піпі. — У цябе ёсць тытунь?

— Не, — сказаў Томі.

— У Анікі ёсць тытунь?

— Ясна, што няма, але…

— Мо ў мяне ёсць тытунь? — спытала Піпі.

— Не, ну, такое, вядома, магчыма… — сказаў Томі. — Але ж мы не курым.

— І менавіта таму я прапаную, каб ты напісаў «без тытуню нам тут каюк»…

— Але я ўпэўнены, што калі я так напішу, то ўсе падумаюць, што мы курым, — пярэчыў Томі.

— Слухай, Томі, — сказала Піпі, — скажы мне адну рэч! У каго часцей няма тытуню: у тых, хто курыць, ці ў тых, хто не курыць?

— Ясна, што ў тых, хто не курыць, — сказаў Томі.

— Дык пра што спрэчка? Вось і пішы, як я сказала!

І Томі напісаў: «Ратуйце нас з выспы, покі мы не сканалі! Без тытуню нам тут каюк праз два дні».

Піпі ўзяла паперку, засунула ў бутэльку, заторкнула коркам і кінула бутэльку ў ваду.

— Усё, хутка за намі прыплывуць ратаўнікі, — сказала яна.

Бутэлька, гайдаючыся, паплыла і хутка знайшла прыстанак у карэнні каля берага.

— Трэба закінуць яе падалей, — сказаў Томі.

— Ну ты сказаў! Дурней не прыдумаеш, — абурылася Піпі. — Калі яна заляціць далёка, то нашы ратаўнікі не будуць ведаць, дзе нас шукаць, але калі яна тут, то мы можам іх паклікаць, калі яны яе знойдуць, і нас адразу ж выратуюць.

Піпі села ля берага.

— Найлепш, калі мы ўвесь час будзем сачыць за бутэлькай, — сказала яна.

Томі і Аніка селі побач. Праз дзесяць хвілін Піпі нецярпліва сказала:

— Што яны сабе думаюць, нібы нам больш няма больш чым заняцца, як сядзець і чакаць, калі нас выратуюць? Дзе яны ўрэшце?

— Хто — яны? — спытала Аніка.

— Тыя, хто павінны нас выратаваць, — адказала Піпі. — Гэта нядбайная бесклапотнасць, проста жахлівая, калі ўлічыць, што вядзецца пра чалавечыя жыцці.

Аніка пачала думаць, што яны папраўдзе скануюць на гэтай выспе. Але раптам Піпі выцягнула ўказальны палец угару і закрычала:

— Каб мяне немач узяла! Што я за разява! Як я магла забыцца?!

— Што? — спытаў Томі.

— Лодка! Я ж занесла яе на бераг учора вечарам, калі вы спалі!

— Але навошта ты гэта зрабіла? — з дакорам спытала Аніка.

— Я баялася, што яна намочыцца, — сказала Піпі.

Вокамгненна яна прынесла лодку, якая была надзейна схаваная пад ялінай.

Яна спусціла яе ў возера і з прыкрасцю сказала:

— Вось так, хай цяпер прыязджаюць! Бо калі яны зараз прыедуць ратаваць нас, то марна.

Бо мы самі сябе выратоўваем. Так ім і трэба. Гэта навучыць іх хутчэй варушыцца.

— Спадзяюся, мы паспеем дабрацца дадому раней за маму і тату, — сказала Аніка, калі яны селі ў лодку і Піпі моцнымі грабкамі накіравала лодку да іншага берага. — Бо інакш як жа будзе хвалявацца мама!

— Я так не думаю, — сказала Піпі.

Але гер і фру Сетэргрэны вярнуліся дадому на паўгадзіны раней за дзяцей. Ніякіх Томі і Анікі яны не ўбачылі. Затое ў паштовай скрыні ляжала паперка, і на ёй было напісана наступнае:

НЯ ДУМАЙЦЭ ШТО ВАШЫ
ДЗЕЦІ ЎМЁРЛЕ АБО ЗНІКЛЕ НАЗАЎЖДЫ
СТОПРАЦЭНТАЎ НЕ. ПРОСТА ЯНЫ
КРАБЛІКРУШЫЛІСЯ І ХУТКА ВЕРНУЦА.
АБЯЦАЮ ХАРАШЫЯ ВІТАНІ АТ ПІПІ

ПІПІ СУСТРАКАЕ ДАРАГОГА ГОСЦЯ

Аднойчы летнім днём Піпі, Томі і Аніка сядзелі на лесвіцы веранды і елі суніцы, назбіраныя да абеду. Гэта быў такі цудоўны адвячорак, калі шчабечуць птушкі і пахне кветкамі і — так-так! — суніцамі. Усё было ціхамірна. Дзеці амаль не размаўлялі, а толькі елі. Томі і Аніка думалі пра тое, як класна, што цяпер лета і школа яшчэ не хутка пачнецца. А што думала Піпі, лепей не ведаць.

— Піпі, ты пражыла на віле «Напракудзіле» цэлы год, — раптам сказала Аніка і абняла Піпі за руку.

— Ага, час ляціць, і мы не маладзеем… — сказала Піпі. — Увосень мне спаўняецца дзесяць гадоў — лічы, найлепшыя дзянькі прамінулі.

— Думаеш, ты заўсёды будзеш тут жыць? — пацікавіўся Томі. — Я маю на ўвазе, пакуль не вырасцеш і не зробішся піраткай.

— Хто ж ведае, — сказала Піпі. — Я думаю, што мой тата не навечна застанецца на тым востраве. Як толькі ён пабудуе новы карабель, ён напэўна прыедзе і забярэ мяне.

Томі і Аніка ўздыхнулі. Раптам Піпі выцягнулася ў струнку, седзячы на лесвіцы.

— Глядзіце, вунь ён, дарэчы, ідзе, — сказала яна і паказала ў бок брамкі.

Томі і Аніка з недаверам паглядзелі туды, куды яна паказала, і ўбачылі, як Піпі кідаецца на шыю вельмі мажнаму дзядзьку са шчаціністымі вусамі і ў сініх марацкіх нагавіцах.

— Тата Эфраім! — крычала Піпі і так радасна махала нагамі, вісячы на яго шыі, што з іх зляцелі яе вялікія чаравікі. — Тата Эфраім, як ты падрос!

— Піпілота Цыкорыя Гардзіна Правіянта Эфраімаўна Доўгая Панчоха, маё любае дзіця! Я толькі хацеў сказаць, што гэта ты падрасла.

— Магу зразумець, — сказала Піпі. — Я ж таму цябе і ўбачыла першая, ха-ха!

— Дзіця маё, ці такая ж ты моцная, як раней?

— Яшчэ мацнейшая, — сказала Піпі. — Падужаемся на руках?

— А давай, — сказаў тата Эфраім.

У садзе стаяў стол, Піпі і яе тата селі за яго дужацца на руках, а Томі і Аніка глядзелі. Ва ўсім свеце толькі адзіны чалавек быў такі ж моцны, як Піпі, — яе тата. Вось яны сядзелі і змагаліся з усіх сіл, але не маглі адужаць адно аднаго.

Нарэшце ў капітана Доўгай Панчохі ўсё-ткі крыху задрыжала рука, і Піпі сказала:

— Калі мне будзе дзесяць гадоў, я цябе адужаю, тата Эфраім.

Тата Эфраім таксама так думаў.

— Але, дарагія сябры, — сказала Піпі, — я ж забыла вас пазнаёміць. Гэта Томі і Аніка, а гэта мой тата, капітан і яго вялікасць Эфраім Доўгая Панчоха, ты ж кароль, тата, праўда?

— Усё дакладна так і ёсць, — сказаў капітан Доўгая Панчоха. — Я кароль барабохаў на востраве, які называецца Барабабох. Я прыплыў да яго нага берага, калі, як ты памятаеш, мяне здзьмула ў мора.

— Менавіта так я і думала, — сказала Піпі. — Я ўвесь час ведала, што ты не патануў.

— Яшчэ чаго! Каб я ды патануў. Патануць для мяне немагчыма гэтак жа, як вярблюду прайсці праз вугольнае вушка. Мой жывот выдатна трымае мяне на плыву.

Томі і Аніка з цікавасцю разглядалі капітана Доўгую Панчоху.

— Дзядзька, а чаму вы не ў барабохскім адзенні? — спытаў Томі.

— Яно тут, у торбе, — сказаў капітан Доўгая Панчоха.

— Надзень-надзень! — закрычала Піпі. — Я хачу паглядзець на свайго тату ў каралеўскіх шатах!

Усе разам яны пайшлі на Піпіну кухню. Капітан Доўгая Панчоха схаваўся ў Піпінай спальні, а дзеці сядзелі на скрыні для дроў і чакалі.

— Дакладна як у тэатры, — сказала Аніка, уся ў прадчуванні відовішча.

І тут — бах! — дзверы адчыніліся, і там стаяў барабохскі кароль. На ім была спадніца з лыка, на галаве — залатая карона, на шыі — карáлі ў некалькі доўгіх радоў, у адной руцэ — кап'ё, а ў другой — шчыт. Бадай, вось і ўсё, ага, яшчэ на шчыкалатках тоўстых валасатых ног — залатыя бранзалеты.

— Абабы́ркі задрыжжа́ізбаіссі! — зароў капітан Доўгая Панчоха, пагрозліва звёўшы бровы.

— О, а што гэта значыць, дзядзя Эфраім? — захоплена спытаў Томі.

— Гэта значыць: «Трапячыце, мае ворагі!»

— Слухай, тата Эфраім, — сказала Піпі, — а барабохі здзівіліся, калі ты выйшаў на бераг іх вострава?

— Яшчэ як. Жахліва здзівіліся, — сказаў капітан Доўгая Панчоха. — Але калі я вырваў пальму голымі рукамі, яны зрабілі мяне сваім каралём. Потым я ўладарыў да абеду, а пасля абеду будаваў карабель. Будоўля заняла шмат часу, бо я будаваў усё сам. Таму гэта невялікае судна. Калі яно было гатовае, я сказаў барабохам, што павінен пакінуць іх ненадоўга, але хутка вярнуся і прывязу з сабой прынцэсу, якую завуць Піпілота. І яны ўдарылі ў свае шчыты і закрычалі: ру́ха-руха!

— Што гэта значыць? — спытала Аніка.

— Гэта значыць: «Ура-ўра!» Цягам наступных чатырнаццаці дзён я ўладарыў як след, каб хапіла ў запас на той час, пакуль мяне не будзе. Потым я ўзняў ветразі і выйшаў у мора, а барабохі крычалі: «Праваля́й дрым-бабы́р папы́р!», што значыць: «Чакаем цябе назад, тоўсты бледны конунг!» Тады я ўзяў курс проста на Сурабаю. І што, вы думаеце, я там убачыў, як толькі ступіў на бе-

раг? Менавіта — маю старую добрую шхуну «Скакуху». І на яе палубе стаяў мой стары добры Фрыдальф і махаў мне як шалёны. «Фрыдальф, я зноў бяру камандаванне на сябе», — сказаў я. «Ёсць, капітан», — сказаў ён. І так сталася. Увесь стары экіпаж застаўся, зараз «Скакуха» стаіць тут у гавані, так што ты можаш пайсці і павітаць усіх сваіх старых сяброў, Піпі.

Піпі так узрадавалася, што стала на галаву на кухонным стале і памахала нагамі. Але Томі і Аніка засумавалі. Яны пачуваліся, быццам у іх забіраюць Піпі.

— А зараз будзе свята! — закрычала Піпі, калі зноў вярнулася на ногі. — Такое свята, што здрыгануцца сцены вілы «Напракудзілы».

І яна выставіла на кухонны стол багатую вячэру, усе разам уселіся і пачалі есці. Сама Піпі праглынула тры звараныя ўкрутую яйкі разам са шкарлупіннем. Час ад часу яна кусала свайго тату за вуха, так яна была радая яго бачыць. Спадар Нільсан, які спаў, раптам прачнуўся і працёр вочы ад здзіўлення, убачыўшы капітана Доўгую Панчоху.

— Каго я бачу! І ты тут, Спадар Нільсан? — сказаў капітан Доўгая Панчоха.

— Ага, і гэта яшчэ не ўсе хатнія жывёлы, — сказала Піпі, схадзіла і прынесла каня, і той таксама атрымаў варанае ўкрутую яйка.

Капітан Доўгая Панчоха быў вельмі задаволены тым, як выдатна яго дачка ўладкавалася на віле «Напракудзіле», і рады, што яна мела пры сабе чамадан золата і ёй не давялося цярпець нястачу, пакуль яго не было.

Калі ўсе наеліся, капітан Доўгая Панчоха дастаў са сваёй торбы шаманскі бубен — барабохі білі ў яго, каб адбіваць такт падчас танцаў ці ахвярапрынашэнняў. І капітан Доўгая Панчоха сеў на падлогу і пачаў біць у бубен. Гук быў глухі і дзіўны, нічога падобнага Томі і Аніка раней не чулі.

І Піпі, скінуўшы свае вялікія чаравікі і застаўшыся ў панчохах, пусцілася ў вельмі дзіўныя скокі. Нарэшце кароль Эфраім станцаваў дзікі ваенны танец, якому навучыўся на востраве барабохаў. Ён круціў кап'ё, дзіка махаў шчытом і тупаў нагамі так моцна, што Піпі крыкнула:

— Глядзі, бо падлога праломіцца!

— Нічога страшнага, — сказаў капітан Доўгая Панчоха, працягваючы кружыцца ў танцы, — усё адно ты цяпер будзеш барабохская прынцэса, мая любая дачка!

Тады Піпі і сама кінулася ў скокі разам з татам. Яны скакалі па коле насупраць адно аднога, радасна вухкалі і раз-пораз высока падскоквалі — у Томі і Анікі закружылася галава толькі ад глядзення на гэтыя скокі. Напэўна, у Спадара Нільсана таксама, бо ён закрываў вочы лапкамі.

Паступова скокі перайшлі ў дужанне ў вольнай барацьбе паміж Піпі і яе татам. Капітану Доўгай Панчосе ўдалося адкінуць дачку так, што яна заляцела на вешалку для капелюшоў. Але там яна не затрымалася. З завываннем яна зрабіла агромністы скок праз усю кухню дакладна на тату Эфраіма.

І ўжо праз секунду яна шпурнула яго так, што ён, як метэор, паляцеў галавой у скрыню для дроў, і цяпер адтуль тырчалі толькі яго тоўстыя ногі. Сам ён выбрацца не мог — часткова праз свой жывот, часткова праз тое, што дзіка рагатаў.

У скрыні для дроў бухала, як гром. Піпі схапіла яго за ногі, каб выцягнуць, але ён ледзь не задыхнуўся ад смеху. Такі ён быў казытлівы.

— Не-не-не казычы мяне, — стагнаў ён. — Выкінь мяне праз акно ў мора ці акіян, што заўгодна, толькі не ка-казычы мне пяткі!

Ён так моцна рагатаў, што Томі і Аніка баяліся, што скрыня для дроў зараз трэсне. Нарэшце яму ўдалося выбрацца, і як толькі ён стаў на ногі, тут жа кінуўся на Піпі і шпурнуў яе праз усю кухню. Наперад тварам яна пляснулася на пліту, дзе было шмат сажы.

— Ха-ха, вось табе і прынцэса, — закрычала задаволеная Піпі, павярнуўшы да Томі і Анікі свой вугальны лычык. З новым крыкам яна накінулася на тату. У яго лыкавай спадніцы нешта трэснула, і частка лыка разляцелася па ўсёй кухні. Залатая карона звалілася і закацілася пад стол. Нарэшце Піпі ўдалося перакуліць тату на падлогу і, усеўшыся на ім, яна сказала:

— Прызнаеш сваю паразу?

— Прызнаю, прызнаю, — сказаў капітан Доўгая Панчоха.

Яны абодва засмяяліся, і Піпі злёгку ўкусіла свайго тату за нос і сказала:

— Я так не весялілася з таго часу, як мы з табой наводзілі парадак у карчме ў Сінгапуры!

Ён залез пад стол і забраў карону.

— Ох, бачылі б гэта барабохі, — сказаў ён. — Каралеўскія рэгаліі — і пад сталом на віле «Напракудзіле».

Ён надзеў карону і прыгладзіў лыкавую спадніцу, якая добра парадзела.

— Давядзецца табе здаць яе ў рамонт, каб пацыравалі, — сказала Піпі.

— Аднак гэта было таго варта, — усміхнуўся капітан Доўгая Панчоха.

Седзячы на падлозе, ён выцер пот з ілба.

— Дарэчы, дзіця маё, Піпі, — сказаў ён, — ці працягваеш ты маніць і цяпер?

— Так, сэр, калі ў мяне ёсць час, але не вельмі часта, — сціпла сказала Піпі. — А ў цябе, дарэчы, як з гэтым? Ты ж і сам хвацкі манюка.

— Бывала, я маніў барабохам суботнімі вечарамі, калі яны добра сябе паводзілі цягам тыдня. Тады мы рабілі маленькія вечарыны падману і мудрасці пад акампанемент бубнаў і танцавалі

з паходнямі. Чым мацнейшай была мая мана, тым грамчэй грымелі бубны.

— Ого, прыемна чуць, — сказала Піпі, — а дзеля мяне дык ніхто не біў у бубны. Я тут хаджу адна-адненькая і так маню сама сабе, ажно радасць бярэ, але мне нават на грабеньчыку ніхто не грае. Нядаўна вечарам, паклаўшыся спаць, я нахлусіла сабе доўгую гісторыю пра цяля, якое ўмела плесці карункавыя сурвэтачкі і лазіць па дрэвах, і, уяўляеш, сама паверыла кожнаму слову! Вось што я называю выдатнай маной! Але так, каб у бубен білі, то не, ніхто такой ласкі мне не робіць.

— Што ж, тады я гэта зраблю, — сказаў капітан Доўгая Панчоха. І ён ўзяўся біць у бубен і рабіў гэта доўга дзеля сваёй дачушкі, а Піпі сядзела ў яго на каленях, прыціскаючыся тварам у сажы да татавай шчакі, так што ягоны твар зрабіўся гэткім жа мурзатым, як у яе.

Аніка стаяла, задумаўшыся пра адну рэч. Яна не ведала, ці дарэчна ёй гэта сказаць, але ўрэшце не стрывала.

— Хлусіць непрыгожа, — сказала яна. — Так кажа мама.

— Аніка, ну што за дурата? — сказаў Томі. — Піпі хлусіць не папраўдзе, а толькі прыкідаецца. Як ты не разумееш, яловая ты галава, што яна проста прыдумляе?

Піпі здзіўлена паглядзела на Томі.

— Часам ты гаворыш так прамудра, што аж страх бярэ, мо які вялікі дзеяч з цябе вырасце, — сказала яна.

Вечарэла. Томі і Аніцы пара было вяртацца дадому. Дзень быў багаты на падзеі, вельмі здорава было паглядзець на сапраўднага барабохскага караля і радасна за Піпі, што нарэшце вярнуўся яе тата. Але-але! Але…

Калі Томі і Аніка дабраліся да сваіх ложкаў і леглі, яны не балбаталі, як звычайна. У дзіцячым пакоі было зусім ціха. Раптам пачуўся ўздых. Гэта ўздыхнуў Томі. Праз імгненне пачуўся яшчэ адзін уздых. Гэтым разам — Анікі.

— Ты чаго ўздыхаеш? — раздражнёна сказаў Томі.

Але адказу ён не атрымаў. Бо Аніка ляжала пад коўдрай і плакала.

ПІПІ ЛАДЗІЦЬ РАЗВІТАЛЬНАЕ СВЯТА

Калі наступнай раніцай Томі і Аніка ўвайшлі праз дзверы вілы «Напракудзілы», на ўвесь дом грымеў жахлівы храп. Капітан Доўгая Панчоха яшчэ спачываў. Але Піпі стаяла на кухні і рабіла ранішнюю гімнастыку, перарваную прыходам Томі і Анікі.

— Ну што ж, будучыня пэўная, — сказала Піпі. — Цяпер я буду барабохскай прынцэсай і паўгода буду хадзіць вакол свету на «Скакусе». Тата лічыць, што калі ён валадарыў у барабохаў паўгода, то яны могуць і пацярпець наступныя паўгода без караля. Бо, разумееце, стары марскі воўк павінен час ад часу адчуваць пад нагамі палубу. Таксама яму трэба дбаць пра маё выхаванне. Калі я хачу аднойчы зрабіцца сапраўды добрай піраткай, то мне нельга ўвесь час жыць толькі пры двары. Тата кажа, што гэта разбэшчвае.

— Ты зусім не будзеш жыць на віле «Напракудзіле»? — разгублена спытаў Томі.

— Ясна, што буду. Калі мы выйдзем на пенсію, — сказала Піпі. — Праз пяцьдзясят-шэсцьдзясят гадоў. Будзем тады з вамі гуляцца і весела бавіць час. У любым разе, вы толькі падумайце — барабохская прынцэса, — летуценна сказала Піпі. — Не многім дзецям так шанцуе. Ах, якой я буду алягантнай! У мяне будуць кольцы ў вушах і трошкі большае кольца ў носе.

— А яшчэ што на табе будзе? — спытала Аніка.

— Больш нічога, — сказала Піпі. — Ані ніткі! Але штораніцы мне давядзецца цалкам намазвацца крэмам для абутку, каб быць чарнаскурай, як іншыя барабохі. Проста штовечар буду ставіць сябе на чыстку разам з чаравікамі.

Томі і Аніка паспрабавалі сабе ўявіць, як будзе выглядаць Піпі.

— Думаеш, чорны колер будзе пасаваць да рудых валасоў? — з сумневам сказала Аніка.

— Паглядзім, — сказала Піпі. — Калі не, дык лёгка перафарбаваць валасы ў зялёны.

Яна радасна ўздыхнула.

— Прынцэса Піпілота! Што за жыццё! Што за бляск! Як жа я буду танцаваць! Прынцэса Піпілота танцуе ў святле вогнішча і пад бой барабанаў. Уяўляеце, як будзе грымець кольца ў носе!

— Калі… калі… ты паездзеш? — спытаў Томі крыху дрыготкім голасам.

— «Скакуха» здымаецца з якара заўтра раніцай, — сказала Піпі.

Усе трое дзяцей даволі доўга стаялі моўчкі. Здавалася, што больш няма чаго сказаць. Нарэшце Піпі яшчэ раз кульнулася ў падскоку і сказала:

— Але сёння ўвечары на віле «Напракудзіле» будзе развітальнае свята. Развітальнае свята, і больш ні слова! Запрашаюцца ўсе, хто хоча развітацца са мной.

Сярод дзяцей маленькага гарадка навіна распаўсюдзілася, як лясны пажар.

«Піпі Доўгая Панчоха паедзе з горада, і на віле «Напракудзіле» будзе развітальнае свята. Туды можна прыходзіць усім, хто захоча!»

Захацелі многія дзеці. Калі дакладна, то трыццаць чатыры чалавекі. Томі і Аніка ўзялі абяцанне са сваёй мамы, што тым вечарам ім можна будзе не

спаць колькі заўгодна. Іх мама зразумела, што гэта абсалютна неабходна. Томі і Аніка мусілі назаўжды запомніць развітальны вечар у Піпі. Гэта быў такі дзівосны цёплы гожы вечар, калі кажаш сабе:

— Вось яно якое — лета-лецейка!

У прыцемках свяціліся і пахлі ўсе ружы ў Піпіным садзе. У старых дрэвах чуўся таямнічы шолах. Усё было б проста цудоўна, калі б толькі не… Калі б не! Томі і Аніка не хацелі дадумваць гэтую думку да канца.

Усе дзеці з гарадка ўзялі з сабой гліняных птушачак і радасна свісталі ў іх, заходзячы ў сад вілы «Напракудзілы». Томі і Аніка крочылі наперадзе. Акурат калі яны дайшлі да лесвіцы на веранду, дзверы адчыніліся, і на парозе стаяла Піпі. Яе вочы ззялі на рабаціністым твары.

— Рада вітаць вас у сваім сціплым прыстанку, — сказала яна і распасцёрла рукі. Аніка ўважліва глядзела на яе, каб добра запомніць, як выглядае Піпі. Ніколі-ніколі яна не забудзе яе — як яна стаіць там са сваімі рудымі коскамі, рабацінкамі, радаснай усмешкай і ў вялікіх чорных чаравіках.

З дома чуўся глухі гук бубна. Капітан Доўгая Панчоха сядзеў на кухні з бубнам на каленях. У гэты дзень на ім таксама было каралеўскае ўбранне. Напэўна, Піпі папрасіла яго пра гэта. Ён жа разумеў, што ўсім дзецям хацелася хоць раз зірнуць на жывога барабохскага караля.

Кухню запоўнілі дзеці, яны стаялі вакол караля Эфраіма і глядзелі на яго. Аніка падумала: добра, што не прыйшло болей людзей, бо інакш усім не хапіла б месца. І толькі яна так падумала, як з саду пачуўся гук акардэона. Ішоў увесь экіпаж «Скакухі» з Фрыдальфам на чале. Гэта граў ён. У той дзень Піпі наведала порт, каб пабачыцца з сябрамі, і запрасіла іх на развітальнае свята. Цяпер яна кінулася да Фрыдальфа і абдымала яго, пакуль той не пасінеў тварам.

Тады яна адпусціла яго і закрычала:

— Музыку! Музыку!

І Фрыдальф зайграў на сваім акардэоне, кароль Эфраім біў у бубен, а ўсе дзеці дзьмулі ў свае свісцёлкі. Вечка скрыні для дроў было адкінутае, унутры стаялі шэрагі бутэлек з ліманадам. На ку-

хонным стале чакала пятнаццаць тортаў з вяршкамі, а на пліце — агромністы чыгун з каўбаскамі.

Кароль Эфраім пачаў умінаць свае восем каўбасак. Усе астатнія ўзялі з яго прыклад, і неўзабаве кухня напоўнілася выключна гукамі паядання каўбасак. Потым ўсе ўзялі сабе столькі торта з вяршкамі і ліманаду, колькі хацелі. На кухні было цеснавата, таму кампанія размеркавалася і па верандзе, і па садзе, у прыцемках паўсюль ззяў торт.

Калі ўсе наеліся, Томі прапанаваў растрэсці каўбаскі і торт і пагуляцца ўва што-небудзь. Напрыклад «Паўтарай за Джонам». Піпі не ведала, як гуляцца ў гэтую гульню, але Томі растлумачыў, што нехта мусіць быць «Джонам», а астатнія паўтараць усё, што «Джон» робіць.

— Давай, — сказала Піпі. — Гучыць няблага. І напэўна, найлепей Джонам буду я.

Яна пачала з таго, што палезла на дах каморы для прасавальнага катка. Для гэтага спачатку трэба было забрацца на садовы плот, а потым на жываце паўзці на дах.

Піпі, Томі і Аніка лазілі раней на дах так шмат разоў, што для іх гэта была легката. Але іншыя

дзеці думалі, што гэта даволі цяжка. Матросы са «Скакухі» прызвычаіліся лазіць на мачты, таму яны таксама далі рады як нічога ніякага. Але вось капітану Доўгай Панчосе гэта было складаней праз ягоны жывот. І яшчэ ён блытаўся ў сваёй лыкавай спадніцы. Узбіраючыся на дах, ён цяжка соп.

— Гэтая спадніца ўжо ніколі не будзе ранейшай, — панура сказаў ён.

З даху каморы Піпі саскочыла на зямлю. Не ўсе меншыя дзеці адважыліся гэта зрабіць, але дапамог Фрыдальф. Ён спусціў усіх, хто баяўся скакаць. Потым Піпі шэсць разоў перакулілася на траве. Усе зрабілі гэтак жа, але капітан Доўгая Панчоха сказаў:

— Трэба, каб мяне падштурхнулі ззаду, бо інакш я ніколі не кульнуся.

Яго падштурхнула Піпі. І так удала, што, пачаўшы, ён не мог спыніцца і куляўся на траве, як мяч, чатырнаццаць разоў замест шасці.

Потым Піпі панеслася на вілу «Напракудзілу», узбегла па лесвіцы на веранду, вылезла ў акно і праз ве-е-ельмі шырокі крок пералезла на драбіны, якія стаялі на двары. Хуценька забраўшы-

ся па драбінах, апынулася на даху вілы «Напракудзілы», прабегла ўздоўж, ускочыла на комін, стала на адну нагу і пракукарэкала, як певень, кінулася галавой наперад на дрэва побач з домам, саслізнула на зямлю, рушыла да пуні, схапіла сякеру, пасекла ў сцяне адну дошку, праціснулася ў вузкую дзіру, ускочыла на плот вакол саду, прайшлася па ім, балансуючы, пяцьдзясят метраў, узлезла на дуб і села адпачыць на самай макаўцы.

На дарозе перад вілай «Напракудзілай» сабралася вельмі шмат народу, потым усе разышліся па дамах і расказвалі, што яны бачылі караля, які стаяў на адной назе на коміне вілы «Напракудзілы» і крычаў «ку-ка-рэ-ку», так што чуваць было далёка вакол.

Але ніхто не даваў веры, што гэта праўда.

Калі капітану Доўгай Панчосе трэба было пралазіць праз вузкую шчыліну ў сцяне пуні, здарылася прадказальнае — ён захрас і не мог пасунуцца ні туды, ні сюды. Таму гульня перарвалася, і ўсе дзеці сабраліся паглядзець, як Фрыдальф выпільваў капітана Доўгую Панчоху са сцяны.

— Д'ябальскі вясёлая гульня, — задаволена сказаў вызвалены капітан Доўгая Панчоха. — А зараз што прыдумаем?

— У старыя добрыя часы, — адказаў Фрыдальф, — капітан і Піпі спаборнічалі, хто мацнейшы. Было вельмі весела назіраць.

— Недурная прапанова, — пагадзіўся капітан Доўгая Панчоха. — Але найгоршае, што мая дачка робіцца мацнейшай за мяне.

Томі стаяў блізка да Піпі.

— Піпі, — шапнуў ён, — я так баяўся, што ты залезеш у нашу хованку ў дубе, калі мы гулялі-ся ў «Паўтарай за Джонам». Бо мне хочацца, каб ніхто ніколі не даведаўся пра яе. Нават калі мы больш ніколі туды не спусцімся.

— Вядома, гэта толькі наш сакрэт, — сказала Піпі.

Яе тата ўзяўся за жалезны лом. Ён сагнуў яго папалам, нібыта той быў з воску. Піпі ўзяла іншы жалезны лом і зрабіла тое самае.

— Ведаеш, — сказала яна, — такімі простымі штукамі я бавілася ў калысцы, толькі каб заняць час.

Тады капітан Доўгая Панчоха зняў кухонныя дзверы. Фрыдальф і яшчэ сем матросаў усе разам сталі на іх, і капітан Доўгая Панчоха падняў іх высока над галавой і пранёс па садзе дзесяць колаў.

Да гэтага часу зусім сцямнела, і Піпі паўсюль запаліла паходні, яны прыгожа зззялі і асвятлялі сад, як у казцы.

— У цябе ўсё? — спытала яна ў таты пасля таго, як ён зрабіў дзясятае кола.

Тата сказаў, што ўсё. Тады Піпі паставіла на кухонныя дзверы каня, на каня сеў Фрыдальф і тры іншыя матросы, і ўсе чацвёра трымалі па двое дзяцей. Фрыдальф трымаў Томі і Аніку. Потым Піпі ўзняла кухонныя дзверы і абнесла іх колам па садзе дваццаць пяць разоў. У святле паходняў гэта глядзелася вельмі прыгожа.

— Праўда, дзіця, ты мацнейшая за мяне, — прызнаў капітан Доўгая Панчоха.

Потым усе паселі на траву. Фрыдальф граў на акардэоне, а іншыя матросы спявалі самыя прыгожыя марацкія песні. Дзеці скакалі пад музыку. Піпі ўзяла ў кожную руку па паходні і танцавала дзічэй за ўсіх.

Свята скончылася феерычна. Піпі запускала ракеты і феерверкі так, што зіхацела ўсё неба. Аніка сядзела на верандзе і глядзела. Усё разам было так прыгожа. Так дзівосна. Яна не бачыла ружаў, але адчувала ў цемры іх водар. Усё было б проста цудоўна, калі б толькі не… не… Быццам халодная рука сціснула сэрца Анікі. Як усё будзе заўтра? І ўсе летнія канікулы? І заўжды? Не будзе болей Піпі на віле «Напракудзіле». Не будзе болей Спадара Нільсана, і конь не будзе стаяць на верандзе. Не будзе больш прагулянак вярхом, не будзе паходаў з Піпі, ніякіх вячэрніх пасядзелак на кухні вілы «Напракудзілы», ніякага ліманаду, што расце ў дрэве. Само дрэва застанецца, але ў Анікі было моцнае прадчуванне, што без Піпі ліманад больш не ўродзіць. Што яны з Томі будуць рабіць раніцай? Верагодна, гуляць у кракет. Аніка ўздыхнула.

Свята скончылася. Падзякаваўшы, усе дзеці развіталіся. Капітан Доўгая Панчоха разам з матросамі вярнуўся на «Скакуху», ён хацеў, каб і Піпі пайшла з імі. Але Піпі сказала, што хоча апошні раз пераначаваць на віле «Напракудзіле».

— Заўтра а дзясятай здымаемся з якара, не забудзься, — крыкнуў капітан Доўгая Панчоха, сыходзячы.

І вось засталіся толькі Піпі, Томі і Аніка. Яны сядзелі моўчкі ў цемры на верандзе.

— Вы ж усё адно можаце прыходзіць сюды і гуляцца, — нарэшце сказала Піпі. — Ключ будзе вісець на цвічку ля дзвярэй. Можаце браць усё, што ляжыць у шуфлядках камоды. І я пакіну лесвіцу ў дубе, каб вы маглі туды лазіць. Адзінае, што, напэўна, ліманад больш не ўродзіць. Не тая паравіна года.

— Не, Піпі, — сур'ёзна сказаў Томі, — мы сюды болей не будзем хадзіць.

— Не, ніколі, ні за што, — сказала Аніка.

І яна падумала, што цяпер будзе зажмурвацца, праходзячы міма вілы «Напракудзілы». Вілы «Напракудзілы» без Піпі… Аніка зноў адчула дотык халоднай рукі да сэрца.

ПІПІ ПАДЫМАЕЦЦА НА БОРТ

Піпі як след зачыніла дзверы вілы «Напракудзілы». Ключ яна павесіла на цвічок адразу побач. Потым яна спусціла каня з веранды — у апошні раз спускала яна яго з веранды! Спадар Нільсан ужо сядзеў з важным выглядам у яе на плячы. Ён зразумеў, што адбываецца нешта значнае.

— Ну што ж, вось і ўсё, — сказала Піпі.

Томі і Аніка кіўнулі. Так, вось было і ўсё.

— Часу яшчэ хапае, — сказала Піпі. — Хадзем пешкі, то будзем ісці долей.

Томі і Аніка зноў паківалі, але нічога не сказалі. І так яны выправіліся ў бок горада. У бок порта. У бок «Скакухі». Конь плёўся так марудна, як хацеў. Піпі азіралася праз плячо на вілу «Напракудзілу».

— Міленькая хата, — сказала яна. — Ніякіх табе блох, і наогул. Напэўна, пра тую гліняную хацінку, дзе я буду жыць далей, так і не скажаш.

Томі і Аніка прамаўчалі.

— Калі з блохамі ў хацінцы зробіцца зусім бяда, — працягвала Піпі, — вазьмуся за іх дрэсіроўку і пасялю ў пачак ад цыгарэт, буду гуляцца з імі ў «Дзве апошнія выбываюць» па вечарах. Завяжу ім маленькія банцікі на ножках. І дзвюх самых надзейных і верных блох я назаву Томі і Аніка, ім можна будзе спаць у маім ложку ўначы.

Нават гэта не змагло разгаварыць Томі і Аніку.

— Ды што з вамі здарылася? — раздражнёна сказала Піпі. — Паміж іншым, паверце вы мне, доўга маўчаць вельмі небяспечна. Язык адсыхае, калі ім не карыстацца. Я была знаёмая з адным абліцоўшчыкам кафляных печак у Калькуце. Ён маўчаў і маўчаў — і здарылася тое, што здарылася. Аднойчы ён збіраўся сказаць мне: «Бывай, дарагая Піпі, шчаслівага падарожжа і дзякуй за гэты час!» І як думаеце, што атрымалася? Спачатку ў яго некалькі разоў жахліва скрывіўся твар, бо заіржавелі шарніры рота, таму мне давялося крыху змазаць іх машыннай алівай. І потым ён выдаў: «Убу-вубу-мубу!» Тады я зазірнула яму ў рот, і ўяўляеце, язык у яго быў як засохлы лісток! І надалей той абліцоўшчык кафляных печак

толькі і мог казаць «Убу-вубу-мубу!» Кашмар, калі гэта здарыцца з вамі. Давайце праверым, ці зможаце вы сказаць лепей, чым той небарака: «Шчаслівага падарожжа, дарагая Піпі, дзякуй за гэты час!» Паспрабуйце, і мы паглядзім!

— Шчаслівага падарожжа, дарагая Піпі, дзякуй за гэты час! — паслухмяна паўтарылі Томі і Аніка.

— Якая радасць, — сказала Піпі. — Вы каго заўгодна напалохаеце! Нават не ведаю, што б я рабіла, калі б вы сказалі «Убу-вубу-мубу!»

Вось яны і прыйшлі ў порт. Там стаяла «Скакуха». Капітан Доўгая Панчоха на борце аддаваў каманды. Матросы бегалі туды-сюды, рыхтуючы ўсё да адпраўлення. На прыстані сабраліся ўсе гараджане, каб развітацца з Піпі. І тут яна прыйшла разам з Томі, Анікай, канём і Спадаром Нільсанам.

— Ідзе Піпі Доўгая Панчоха! Прапусціце яе! — прагучаў крык, і народ расступіўся, каб даць Піпі прайсці.

Піпі ківала і віталася направа і налева. Яна падняла каня і панесла яго па трапе. Няшчасная жывёліна падазрона аглядалася, бо коні — не аматары марскіх падарожжаў.

— Вось і ты, маё любае дзіця, — сказаў капітан Доўгая Панчоха і на хвілю перастаў камандаваць, каб абняць Піпі.

Ён прыціснуў яе да грудзей, і яны абдымаліся так, што рэбры трашчалі.

Аніка ўсю раніцу хадзіла з камяком у горле. І калі яна ўбачыла, як Піпі заносіць на борт каня, камяк расціснуўся. Яна заплакала там, дзе стаяла, ля кантэйнераў на прыстані, спачатку зусім ціха, а потым усё больш і больш адчайна.

— Не раві ты, — сярдзіта сказаў Томі. — Ганьбіш нас тут перад усімі!

Ад ягоных ушчуванняў Аніку прарвала яшчэ болей, яна залілася рэкамі слёз. Яна ажно скаланалася ад рыданняў. Томі пхнуў каменьчык, і ён пакаціўся па прыстані і ўпаў у ваду. Насамрэч Томі хацелася кінуць яго ў «Скакуху», гэты варты жалю карабель, які павінен быў забраць ад іх Піпі! Вось праўда — калі б ніхто не бачыў, Томі б таксама паплакаў. Але нельга было. Ён пхнуў яшчэ адзін каменчык.

Піпі подскакам спусцілася па трапе да Томі і Анікі. Узяўшы іх за рукі, яна сказала:

— Засталося дзесяць хвілін.

Тады Аніка легла ніцма на кантэйнер, рыдаючы проста на разрыў сэрца. У Томі не засталося ніякіх каменьчыкаў, каб іх пхаць. Ён сціснуў зубы і стаяў з такім выглядам, быццам зараз яго разарве.

Вакол Піпі сабраліся ўсе дзеці маленькага гарадка. Яны дасталі свае свісцёлкі і дудзелі для яе развітальную мелодыю. Гучала неапісальна журботна, бо гэта была вельмі-вельмі жаласная мелодыя. Аніка рыдала і ледзь трымалася на нагах. І тут Томі ўзгадаў, што напісаў развітальны верш у гонар Піпі. Ён дастаў паперку і пачаў чытаць. Прыкра было толькі тое, што голас здрадліва дрыжаў!

Бывай, дарагая Піпі, паедзеш ты ад нас,
але мы — твае верныя сябры, успамінай гэта падчас
і той час,
які быў проста клас.

— Ух ты, усё ў рыфму, — задаволена сказала Піпі. — Я вывучу гэта на памяць і буду чытаць барабохам вечарамі, калі мы будзем сядзець ля вогнішча.

Вакол сабраўся натоўп дзяцей, якія хацелі развітацца. Піпі падняла руку і папрасіла цішыні.

— Дзеці, — сказала яна. — Цяпер я буду гуляцца толькі з дзецьмі-барабохамі. Як мы будзем забаўляцца, лепш нават не ведаць. Магчыма, мы будзем гуляць у даганялкі з дзікімі насарогамі, заклінаць змей, катацца вярхом на сланах, гайдацца на арэлях паміж какосавых пальмаў. Заўжды будзем намагацца неяк прабавіць час.

Піпі зрабіла паўзу. Томі і Аніка ўжо злаваліся на тых дзяцей, з якімі Піпі будзе гуляцца ў будучыні.

— Але, — працягнула Піпі, — магчыма, надыдзе неяк дзень у перыяд дажджоў, які будзе доўгі і нудны, бо хоць бегаць без вопраткі пад дажджом весела, усё адно рабіць будзе больш няма чаго, а толькі мокнуць. І калі мы набегаемся як след, то, напэўна, залезем у маю гліняную хацінку — калі, вядома, хацінка не разбурыцца ад вады, але калі разбурыцца, мы зможам мяшаць з гліны кашу-малашу. Але калі ўсё-ткі хацінка ацалее, мы сядзем унутры — дзеці-барабохі і я, — і, магчыма, дзеці папросяць: «Піпі, раскажы што-небудзь!» І тады я раскажу ім пра маленькі гарадок, які знаходзіцца

далёка-далёка ў іншай частцы свету, у якім жывуць маленькія белыя дзеці. «Вы не паверыце, якія незвычайныя дзеці жывуць там, — скажу я, — белыя, як анёлкі, усім целам апроч пятак, яны дудзяць у гліняныя свісцёлкі і — самае адметнае — знаюцца на мнаганожанні». Зрэшты, дзеці-барабохі могуць засмуціцца, што ў іх няма мнаганожання, што ж тады мне з імі рабіць? У найгоршым выпадку я разбуру і патаўку сваю гліняную хацінку, каб мы маглі пагуляцца ў кашу-малашу і закапацца ў гліну па шыю. Бо я — не я, калі не змагу пераключыць іх думкі на што-небудзь іншае, апроч мнаганожання. Дзякуй вам усім! І бывайце, мае дарагія!

І дзеці задудзелі ў свае свісцёлкі яшчэ жаласней, чым раней.

— Піпі, час падымацца на борт! — крыкнуў капітан Доўгая Панчоха.

— Ёсць, капітан, — сказала Піпі.

Яна павярнулася да Томі і Анікі. Паглядзела на іх. «Якія дзіўныя ў яе вочы, — падумаў Томі, — дакладна як у мамы, калі аднойчы я вельмі моцна захварэў». Аніка грудком ляжала на кантэйнеры. Піпі падняла яе і абняла.



— Бывай, Аніка, бывай, — шапнула яна. — Не плач!

Аніка абняла Піпі за шыю і горка ўздыхнула.

— Бывай, Піпі, — сказала яна, усхліпваючы.

Піпі ўзяла Томі за руку і моцна яе паціснула. Потым яна ўзбегла па трапе. Тады буйная слязіна ўпала з носа і ў Томі. Ён сціснуў зубы, але не дапамагло, выкацілася яшчэ адна слязіна. Ён

узяў Аніку за руку, і яны глядзелі Піпі ўслед, як яна стаіць на палубе. Але калі глядзіш праз завесу слёз, то заўжды ўсё крыху размытае.

— Няхай жыве Піпі Доўгая Панчоха! — закрычалі людзі на прыстані.

— Прыбраць трап, Фрыдальф! — крыкнуў капітан Доўгая Панчоха.

Фрыдальф выканаў каманду. «Скакуха» была гатовая адправіцца ў сваё падарожжа да далёкіх берагоў. Але тут…

— Не, тата Эфраім, — сказала Піпі. — Я так не магу. Я не магу гэтага трываць!

— Чаго ты не можаш трываць? — спытаў капітан Доўгая Панчоха.

— Таго, што нехта на зямлі праз мяне плача і маркоціцца. Асабліва Томі і Аніка. Стаўце трап назад! Я застаюся на віле «Напракудзіле».

Капітан Доўгая Панчоха крыху пастаяў моўчкі.

— Рабі, як пажадаеш, — нарэшце сказаў ён. — Як ты заўжды рабіла!

Піпі згодна кіўнула.

— Так, я заўжды так рабіла, — спакойна сказала яна.



І яны зноў абняліся — Піпі і яе тата — так, што затрашчалі рэбры. Яны ўмовіліся, што капітан Доўгая Панчоха будзе часта-часта наведваць Піпі на віле «Напракудзіле».

— Бо як думаеш, тата Эфраім, — сказала Піпі, — дзецям жа лепей мець сапраўдны дом, чым ганяць па морах і акіянах і жыць у глінянай хацінцы?

— Ты маеш рацыю, дачка мая, — сказаў капітан Доўгая Панчоха. — Відавочна, што на віле «Напракудзіле» ў цябе больш упарадкаванае жыццё. І гэта, напэўна, лепш за ўсё для маленькіх дзяцей.

— Менавіта, — сказала Піпі. — Маленькім дзецям сто працэнтаў патрэбны парадак. Асабліва такі, які яны самі сабе заводзяць!

Піпі развіталася з матросамі на «Скакусе» і абняла тату Эфраіма апошні раз. Потым яна падняла каня сваімі моцнымі рукамі і аднесла яго назад па трапе. І «Скакуха» знялася з якара. Але ў апошні момант капітан Доўгая Панчоха ўспомніў адну рэч.

— Піпі, — крыкнуў ён, — табе трэба яшчэ трохі золата! Вазьмі гэта!

І ён кінуў чамадан з залатымі манетамі. Але, на жаль, «Скакуха» адышла задалёка ад прыстані. Чамадан не даляцеў.

«Плюх!» — сказаў чамадан і патануў. Па натоўпе прайшоў уздых расчаравання. Але тут пачуўся яшчэ адзін плюх. Гэта Піпі дала нырца. І ўжо праз імгненне яна вынырнула з чамаданам у зубах. Яна вылезла на прыстань і скінула вадарасці са сваіх вушэй.

— Ха, я цяпер зноў багатая, як троль! — сказала яна.

Томі і Аніка ўсё яшчэ не сцямілі, што адбылося. Раскрыўшы раты, яны тарашчыліся на Піпі, каня, Спадара Нільсана, чамадан і «Скакуху», якая на ўсіх ветразях выходзіла з гавані.

— Ты… ты што, не на караблі? — няўпэўнена спытаў Томі.

— Здагадайся з трох разоў, — сказала Піпі і выціснула ваду са сваіх косак.

Потым яна пасадзіла Томі, Аніку і Спадара Нільсана на каня, закінула чамадан і заскочыла сама.

— Назад на вілу «Напракудзілу»! — гучна крыкнула яна.

Нарэшце да Томі і Анікі дайшло. Томі зрабіўся такі шчаслівы, што адразу ж заспяваў сваю ўлюбёную песню: «Галопам скачам з трум-ба-бумам!»

Аніка так нарыдалася, што не адразу змагла спыніцца. Яна ўсё яшчэ ўсхліпвала, але гэта былі маленькія шчаслівыя ўсхліпы, якія хутка прайшлі. Піпі моцна трымала яе за пояс. Было так спакойна і бяспечна. О, усё было проста цудоўна!

— Што мы сёння будзем рабіць, Піпі? — спытала Аніка, калі перастала ўсхліпваць.

— Ну-у, гуляць у кракет, можа быць, — сказала Піпі.

— З задавальненнем, — сказала Аніка.

Яна ведала, што нават гульня ў кракет будзе іншай разам з Піпі.

— Ці, можа быць… — сказала Піпі, вагаючыся.

Усе дзеці маленькага гарадка сабраліся вакол каня, каб пачуць, што скажа Піпі.

— Ці можа быць… — сказала яна. — Ці, можа быць, ірванем на ручай і павучымся хадзіць па вадзе.

— Па вадзе хадзіць немагчыма, — сказаў Томі.

— Нічога не немагчыма, — сказала Піпі. — На Кубе я неяк сустрэла аднаго цесляра, які…

Конь пусціўся галопам, і дзеці, што сабраліся вакол яго, не пачулі працягу. Але яны стаялі яшчэ доўга-доўга і глядзелі ўслед Піпі і яе каню, які скакаў галопам у напрамку вілы «Напракудзілы». Неўзабаве яны маглі разглядзець толькі кропачку ўдалечыні. А пасля і тая знікла.

ПАСЛЯМОВА

Пры сучасных перавыданнях «Піпі падымаецца на борт» друкуецца з некаторымі праўкамі самой Астрыд Ліндгрэн. Датрымліваючыся характару яе правак 1993 года, выдавецтва Rabén & Sjögren і праваўладальнікі Saltkråkan AB замяняюць прыметнік, утвораны ад «н-слова», паўсюль, дзе ён сустракаецца, прыметнікам «ціхаакіянскі».

ЗМЕСТ

Піпі ўсё яшчэ жыве на віле «Напракудзіле» 5
Піпі ідзе па крамах 13
Піпі піша ліст і ходзіць у школу, але толькі крыху 39
Піпі ідзе ў школьны паход. 52
Піпі ідзе на кірмаш 70
Піпі цярпіць караблекрушэнне 93
Піпі сустракае дарагога госця 121
Піпі ладзіць развітальнае свята 134
Піпі падымаецца на борт 146
Паслямова 159

ПА ПЫТАННЯХ НАБЫЦЦЯ КНІГ ЗВЯРТАЙЦЕСЯ:
г. Мінск, тэл. (8-10-375-17) 272-29-75;
e-mail: mail@popuri.ru; www.popuri.ru

Літаратурна-мастацкае выданне

Ліндгрэн Астрыд

ПІПІ ДОЎГАЯ ПАНЧОХА ПАДЫМАЕЦЦА НА БОРТ

Для сярэдняга школьнага ўзросту

Ілюстрацыі *Інгрыд Ванг Нюман*
Пераклад са шведскай *Алены Казловай*

Адказны рэдактар *Наталля Давыдоўская*
Літаратурны рэдактар *Алена Пятровіч*
Карэктар *Віктар Іваноў*
Вёрстка *Вольгі Самсонавай*
Дызайнер вокладкі *Ніна Дулуб*

Падпісана да друку 25.09.2020. Фармат 70×90/16. Папера мелаваная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,00. Тыраж 2350 экз. Заказ 373/10_2020.

ТАА «Папуры». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/150 ад 24.01.2014 г.
Рэспубліка Беларусь, 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 5, корп. 2, к. 403.

Надрукавана ў ТАА «ХКФ Юнісофт».
Украіна, 61036, г. Харкаў, вул. Марозава, 136.
www.unisoft.ua

Дата вырабу: лістапад 2020.

Піпі Доўгая Панчоха — самая моцная, самая добрая, самая вясёлая і самая багатая дзяўчынка на свеце. Яна жыве зусім адна на віле «Напракудзіле». У яе ёсць конь і малпачка — Спадар Нільсан. А яшчэ — чамадан, набіты залатымі манетамі.

Томі і Аніка вельмі любяць бавіць час са сваёй сяброўкай і вельмі рады, што яна нарэшце пачала хадзіць у школу (праўда, зусім крыху). Піпі ладзіць пікнікі і караблекрушэнні, купляе васямнаццаць кілаграм цукерак, уціхамірвае ўдава і нарэшце сустракаецца са сваім татам, які і праўда аказаўся ціхаакіянскім каралём.

Гісторыя пра Піпі Доўгую Панчоху ўпершыню выйшла ў 1945 годзе, і з таго часу яе палюбілі некалькі пакаленняў дзяцей з розных краін.

У 2020 годзе адзначаецца 75-годдзе самай знакамітай дзяўчынкі на свеце. Да юбілею мы падрыхтавалі новыя пераклады дзвюх гісторый пра Піпі з класічнымі ілюстрацыямі ІНГРЫД ВАНГ НЮМАН.

ПОПУРРИ
popuri.ru
ISBN 978-985-15-4681-3
9 789851 546813
0+

Астрыд Ліндгрэн

Пеп

Пеп, дзяўчынка Панчоха Падымаецца на борт